„РАЗЬВІЦЬ УЗМОЦНЕНУЮ РАБОТУ ПА АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧЫМ УМАЦАВАНЬНІ КАЛГАСАЎ“ (ЦК УсеКП(б)

Пралетары ўсіх краёў, аднаўцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 235 (41340)
НЯДЗЕЛЯ 30 жніўня 1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

Выцерабіць увесь лён, ня зьніжаць тэмпаў ільнаўборкі

УБРАНА—69,2% ПАСЕВАЎ ІЛЬНУ, АПРАЦАВАНА-Ж ТОЛЬКІ—13%

УСЕ СІЛЫ НА ФАРСАВАНЬНЕ УБОРКІ І АПРАЦОЎКІ

Ліквідаваць разрыў паміж уборкай і апрацоўкай ільну

Апублікаваная ўчора ў «Зьвязьдзе» зводка НКЗ БССР аб ходзе ўборкі і апрацоўкі ільну сыгналізуе аб сур'ёзных прарывах на гэтым адказнейшым участку.

Апошняя пяцідневка дала зусім нездавальняючы прырост у выкананьні плану ўборачнай кампаніі тэхкультур. Прычым гэты прырост, параўнальна з мінулай пяцідневкай, зьменшыўся больш чым на 4 проц. Такім чынам тэмпы ільнаўборкі ЗНІЗІЛІСЯ, што зьяўляецца зусім НЕДАПУШЧАЛЬНЫМ.

На 25 жніўня ўбрана па БССР 68,9 проц. пасеваў ільну. Саўгасы ўбралі 20,4 проц. пасеваў тэхкультур, калгасы —69,1 проц., індывідуальны сэктар—69,3 проц. Паасобныя ільнаводчыя раёны па-ранейшаму цягнуцца ў глыбокім тыле ўборачнай кампаніі. Напрыклад, АСЬВЕЙСКІ раён убраў толькі 22,3 проц. пасеваў ільну, БЕШАНКОВІЦКІ —23,8 проц., ВІЦЕБСКІ—29,2 проц., ДРЫСЕНОЦКІ—32,8 проц., ПОЛАЦКІ — 29,2 проц. і ЧАШНІЦКІ—49,6 проц. Між тым, гэтыя раёны зьяўляюцца ільнаводнымі

Такое становішча з усёй сур'ёзнасьцю сьведчыць аб наяўнасьці ДЭМАБІЛІЗАЦЫЙНЫХ настрояў з боку цэлага раду раённых арганізацый. Адставаньня саўгасаў і часткі рашаючых ільнаводчых раёнаў ні ў якім разе НЕЛЬГА ЦЯРПЕЦЬ. Карэнныя гэтага адставаньня хаваюцца ў НЕВЫСТАРЧАЛЬНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ, у адсутнасьці правільнай РАССТАНОЎКІ СІЛ на ўборачных работах, у слабым, зусім нездавальняючым укараненьні ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ.

Працоўная дысцыпліна ва многіх калгасах усё яшчэ не стаіць на патрэбным узроўні. Калгасы ў радзе выпадкаў пераходзяць на зьдзельшчыну толькі фармальна, на паперы. Па сутнасьці захоўваецца адкрытая ці падпраўленая падзёншчына. Раённыя арганізацыі яшчэ і на сёнешні дзень далёка ня ўсюды па-бальшавіцку ўзяліся за ўмацаваньне калгасаў, не разагнулі РАШУЧАЙ І ПАСЬЛЯДОЎНАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ, АЦЭНЕНУЮ Ў ПРАЦАДНЁХ, СУПРОЦЬ УРАЎНІЛАЎКІ І ".БЯЗЬЛІЧКІ.

Бязьдзейнасьць паасобных арганізацый, якія праходзяць мімо задач умацаваньня калгасаў, грае на руку кулаку. Кулак пры дапамозе сваёй агентуры—правых і «левых» апартуністаў—шалёна імкнецца затармазіць ільнаўборку. Карэспандэнцыі, якія зьмяшчаюцца сёньня ў «Зьвязьдзе», паказваюць, што ў паасобных выпадках кулак не сустракае свячасовага і рашучага адпору. У калгасе «БЯЗБОЖНІК», ЛЁЗЬНЯНСКАГА РАЁНУ, напрыклад, кулацкія элемэнты беспакарана вядуць агітацыю супроць зьдзельшчыны, тармозячы гэтым правядзеньне ўборкі. Такія фанты ёсьць і ў другіх раёнах.

Арганізацыя ЎЗАЕМАДАПАМОГІ паміж калгасамі яшчэ не пашырана. Гэты МАГУТНЫ сродак барацьбы за найхутчайшую ўборку ільну ў радзе раёнаў проста ігнаруецца. Вольная рабочая сіла калгасаў, якія скончылі ільнаўборку, свячасова не перакідваецца ў адстаючыя калгасы для дапамогі ім у правядзеньні ўборачнай кампаніі. Між тым сацыялістычная ўзаемадапамога саўгасаў і калгасаў мае ВЫКЛЮЧНА ВАЖНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ. Аб гэтым яркі сьведчыць вопыт ШКЛОЎСКАГА раёну, дзе мясцовыя арганізацыі здолелі мабілізаваць масы на барацьбу за лён. Добра наладжанае апэрацыйнае кіраўніцтва і разгортваньне ўзаемнай дапамогі паміж калгасамі, правільная расстаноўка сіл і пераход на зьдзельшчыну—ЗАБЯСЬПЕЧЫЛІ Ў ГЭТЫМ РАЁНЕ ЎДАРНЫЯ ТЭМПЫ НА ФРОНЦЕ ІЛЬНАЎБОРАЧНАЙ. У Шклоўскім раёне ўжо выцераблена 84 проц. пасеваў ільну.

Апартуністычная стаўка выключна на завоз ільнацерабілак яшчэ не дабіта. Многія калгасы, чакаючы машын, ня прымаюць ніякіх мер, каб мабілізаваць наяўныя кадры на ільнаўборку. Старшыня калгасу імя 12-цігодзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі, напрыклад, адкрыта заявіў, што ня будзе ўбіраць лён, пакуль МТС ня дасьць калгасу ільнацерабілак.

Апартуністычная стаўка на самацёк і толькі на завоз машын, усякія гутаркі аб недахваце рабочай сілы, пад якімі хаваецца нежаданьне праявіць ініцыятыву і мабілізаваць уласныя рэсурсы,—павінны атрымаць самы РАШУЧЫ АДПОР. З гэтай кулацкай практыкай трэба сурова змагацца.

У самы бліжэйшы час ільнаўборка павінна быць з ПОСЬПЕХАМ СКОНЧАНА. Партыйныя арганізацыі ільнаводчых раёнаў абавязаны напружыць усе свае сілы, мабілізаваць усю энэргію, узьняць масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў на барацьбу за нездкладнае скончэньне ільнаўборачнай кампаніі. Трэба ПАТРОІЦЬ, УДЗЕСЯЦЯРЫЦЬ ТЭМПЫ ІЛЬНАЎБОРКІ. Трэба даражыць кожнай мінутай з тым, каб не дапусьціць ні найменшай маруднасьці ў завяршэньні ўборачнай кампаніі тэхкультур. ПАСЬПЯХОВАЯ ЎБОРКА І АПРАЦОЎКА ІЛЬНУ—АДНО З САМЫХ ВАЖНЫХ РАШАЮЧЫХ ЗЬВЕНЬНЯЎ АРГАНІЗАЦЫЙНА - ГАСПАДАРЧАГА ЎМАЦАВАНЬНЯ ІЛЬНАВОДЧЫХ КАЛГАСАЎ.

Трэба шырока разгарнуць сацыялістычную ўзаемадапамогу паміж калгасамі і саўгасамі, трэба зруйнаваць апартуністычныя рагаткі, якія стаяць на шляху зьдзельшчыны

Правільна арганізаваўшы працу і расставіўшы сілы, укараніўшы зьдзельшчыну, ацэненую ў працадніёх, наладзіўшы дакладны ўлік працы, трэба ў самы бліжэйшы час убраць увесь лён да апошняга гэктара.

ЗВОДКА НКЗ, зьмешчаная ва ўчарайшым нумары «Зьвязды», паказвае на наяўнасьць вялізарнага разрыву паміж уборкай і апрацоўкай ільну. Апрацоўка ільну разгортваецца ганебна марудныя тэмпамі. Раённыя арганізацыі пакідаюць апрацоўку ільну на апошнюю чаргу, што пагражае сур'ёзнымі стратамі ўраджаю. З такім становішчам трэба пакончыць. ФАРСУЮЧЫ ІЛЬНАЎБОРАЧНУЮ, мы абавязаны максымум увагі аддаць разгортваньню АПРАЦОЎКІ ІЛЬНУ. Пры гэтым нельга ні на адну мінуту забываць аб якасьці апрацоўкі

Арганізацыя ІЛЬНЯНОГА КАНВЭРУ на аснове зьдзельшчыны і правільнай расстаноўкі сіл павінна ў самы бліжэйшы час ліквідаваць РАЗРЫЎ паміж уборкай і апрацоўкай ільну.

Зьмятаючы са шляху апартуністаў, руйнуючы супраціўленьне кулака, з посьпехам і ў тэрмін убярэм і апрацуем лён

Арганізацыя ўзаемадапамогі паміж калгасамі

ЗАБЯСЬПЕЧЫЛА ЎДАРНЫЯ ТЭМПЫ ЎБОРКІ ІЛЬНУ

ПІКЛОЎ. На 26-е жніўня па калгасах Шклоўскага раёну выцераблена 3630 гэкт., або 84,3 проц., па аднаасобным сэктары 3631 гэкт., што складае 93 проц.

На аснове сапраўднай зьдзельшчыны і шырокага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў 8 сельсаветах калгасы закончылі ўборку ільну на 100 проц. Па аднаасобным сэктары ў гэтых сельсаветах поўнасьцю таксама закончана ўборка. 5 калгасаў СТАРА-ВАДВЯНСКАГА сельсавету, якія датэрмінова скончылі ўборку ільну, арганізавалі ўдарныя брыгады і паспалі на дапамогу калгасу «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ». 40 жанчын калгасу «Чырвоная зорка» за 18 дзён выцерабілі 82 гэкт. ільну і такім чынам ушчыльнілі тэрмін уборкі на 13 дзён.

Вялікую дапамогу калгасам аказваюць аднаасобнікі бядняки і серадняки. У калгасе «Улыпянка» за адзін дзень аднаасобнікі выбралі 2,5 гэкт. ільну.

Ня гледзячы на дрэннае надвор'е, апрацоўка ільну праходзіць узмоцненым тэмпам. На 25 жніўня калгасамі абчосана 4.000 тон ільнасапомы і аднаасобным сэктарам 3.975 тон.

Зусім дрэнна пастаўлена праца ільнацерабілак. Рад дэталяў не падагнаны, асабліва часта псуюцца цэпі. МТС і райкалгасаюз не падрыхтавалі адпаведных працаўнікоў, у выніку чаго адна машына за 10 гадзін выбірае толькі адзін гэкт.

Настаўніцтва раёну мабілізавана на дапамогу буйному ільнаводчаму калгасу «БАРАЦЬБА», які засеяў 520 гэкт. ільну і ўбраў ужо 275 гэкт. Настаўнікі будуць працаваць у гэтым калгасе 2 дні.

Райком КСМ дадаткова накіраваў 100 чалавек камсамольцаў на дапамогу калгасу «КАРЛА МАРКСА» тэрмінам на 3 дні. Ян.

Лён слаць толькі абмалочаны

ЧАШНІКІ. У Чашніцкім раёне ў радзе калгасаў лён, які толькі што выцераблен, расьсьцілаецца на ільнянішчы з галоўкамі. У выніку такога галавацяпства мы будзем мець да канца вылежкі ільну 100 проц. страты ільнасемя і частковую страту ільнавалакна, якое на ільнянішчы гніе. Трэба ўзьняць такі лён, прасушыць у шатрох, абмалаціць і разаслаць на адпаведных сьцеліішчах.

Б. Мясьнікоў.

Кулакі зрываюць апрацоўку ільну

ЛЁЗНА. У выніку адсутнасьці зьдзельшчыны ў калгасе «Бязбожнік» заняпала працадысцыпліна. У калгасе няма правільнага ўліку працы. Члены праўленьня калгасу сыстэматычна п'янствуюць. У жывёлавода калгасу Казлова не хапае 2 з пал. пудаў масла. Член праўленьня калгасу Шайрка за выпіўку з сваякамі —аднаасобнікамі, дазволіў ім касіць калгаснае жыта, капюшыну і сена. Дзякуючы злачынной нядбайнасьці загадчыка гаспадаркі Несьцерава інвэнтар расцідан, іржавее і псуецца, частка калгаснай маемасьці расьцягваецца па дварох аднаасобнікаў. Крытыка і самакрытыка ў калгасе адсутнічае.

У выніку ўсяго гэтага правальваецца ўборачная і асеньняя пасеўная кампанія.

На 20-га жніўня ільну ўбрана 50 гэктараў замест 155. Да абмалоту і расьсьцілу ільну калгасы не прыступілі. Ня скошана 30 гэктараў сенажаці. Для засеву азімых падрыхтавана толькі 20 гэктараў зямлі замест 140.

Падрыўшчыкі калгасу Казлоў, Шайрка і Несьцераў адданы пад суд, але ў калгасе засталося шмат кулацка-заможных гаспадарак, большасьць якіх вядзе падрыўную работу. Старшыня калгасу таксама на баку заможнікаў.

Неабходна правесьці чыстку калгасу ад клясава варожых элемэнтаў. Райкалгассаюз павінен прыняць самыя нездкладныя і рашучыя меры да аздараўленьня калгасу «Бязбожнік» і забясьпечыць свячасовую і поўную ўборку, апрацоўку ільну і засеў азімых.

Чэкмераў, Граўс і Гейслаў.

Выцераблены лён не апрацоўваецца

ЛЁЗНА. Калгасы Лёзьнянскага раёну павінны ўбраць 6.200 гэктараў ільну. На 23-га жніўня выцераблена каля 75% ільну. Рад калгасаў церабленьне ільну скончыў, але работа па апрацоўцы ільну ў калгасах не наладжана. Большасьць калгасаў да абчосу, абмалоту, мочцы расьсьцілу ільну да гэтага часу не прыступіла. Арганізацыяй капвэсрнай уборкі ільну раённыя арганізацыі ня кіруюць. Паасобныя калгасы, як напрыклад, калгас «Ударнік», Унаўскага сельсавету паказваюць узорныя прыклады ўборкі. У гэтым калгасе брыгада з 10 чалавек адзін дзень выцерабілала па 2 гэктары ільну.

Між тым райкалгассаюз не абагульняе вопыту лепшых калгасаў і не пераносіць іх ў другія калгасы. Прэміяваньне лепшых калгасьнікаў і калгасаў таксама не праводзіцца.

ЧЭКМЕРАЎ, ГРАЎС І ГЕЙСЛАЎ.

Брыгадзірша дае нарад на работу

„Калі МТС ня дасьць ільнацерабілак, я лён заару“

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА. Уборка ільну па калгасах, якія абслугоўваюцца Танежыцкай МТС, праходзіць у асноўным здавальняюча. На 15 жніўня з 515 гэкт. было ўбрана 282 гэкт. — звыш 50 проц. 12 калгасаў Заматільскага, Старчыцкага і Макранскага сельсаветаў скончылі ўборку.

Побач з гэтым у некаторых калгасах уборка ільну праходзіць вельмі дрэнна. У калгасах «Дуб» з 14 гэкт. убрана 4 гэкт., «Воля» — з 20 гэкт. убрана 8.

Яшчэ горш у калгасе «XII-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі». 18 гэкт. ільну высьпела, але старшыня калгасу Коберц не пасылае вольных рук на церабленьне ільну. Ён спадзяецца выключна на ўборку машынамі і заяўляе: «Калі Танежыцкая МТС ня дасьць ільнацерабілак, то я рабочых рук на ўборку ільну не перакіну, лепш я яго заару». Апартуніст Коберц брыгад па ўборцы ільну не стварае.

Трактарацэнтр прыехаў некалькі машын па абмалоце і ачосе ільна-галовак. Машыны разьмеркаваны па калгасах, а Трактарацэнтр патрабуе вярнуць іх назад у Менск. Мы пытаем, чаму робіцца такое галавацяпства?

Райкалгассаюз павінен рашуча ўдарыць па кулацкіх памочніках тыпу Коберца, якія, у надзеі на машыны, зрываюць уборку ільну.

Н. М.

ПЛЕШЧАНІЦЫ ПРАВАЛЬВАЮЦЬ УБОРКУ ІЛЬНУ

ПЛЕШЧАНІЦЫ. У Плешчаніцкім раёне засеяна 1.331 гэкт. ільну. На 25-га жніўня ўбрана толькі 116 гэкт. Сельсаветы і калгасы не разгарнулі свячасовай уборкі ільну. У выніку гэтага ўбрана толькі 8 проц. усёй плошчы.

Толькі калгас імя Дзяржынскага ўбраў увесь лён (11 гэкт.) і палову замачыў

САКАЛОЎСКІ.

Папяровая сувязь аграномаў з калгасамі

ДУБРОЎНА. У Дубровенскім раёне налічваецца каля 15 аграномаў. Але-ж ня гледзячы на такую колькасьць, ні адзін з аграномаў не выяжджае для практычнай дапамогі ў працы калгасаў. Замест практычнага жывога кіраўніцтва, шляхам наведваньня калгасаў, аграномы абмяжоўваюцца тым, што высылаюць са сваіх габінэтаў інструкцыі. Між іншым, справа апрацоўкі ільну — справа новая, яна патрабуе больш-менш кваліфікаваных работнікаў, якіх у калгасах не хапае. Тут павінны адыграць вялікую ролю аграномы і іншыя спэцыялісты, якія ёсьць у цэнтры раёнаў, шляхам выезду на месцы ў калгасы. Яны павінны праверыць, ці правільна скарыстоўваюцца машыны, ды ня толькі праверыць, а і паказаць, як трэба абыходзіцца з імі, дапамагчы складзці канкрэтны плян працы. На жаль, гэтай работы агранэрсанал і спэцыялісты раёнаў не праводзяць. Кіраўніцтва з габінэтаў, шляхам пасылкі паперак, дае мала карысьці. Калгасы трэба забясьпечыць жывым кіраўніцтвам.

Вось задача, якую раённыя арганізацыі павінны правесьці ў жыцьцё.

М. К.

ЗЖАТАЕ ЗБОЖЖА—У КОПЫ

Яравыя неадкладна убраць і зьвезьці у гумны

Складаньнем збожжа ў копы і прасушкай паменшым страты ўраджаю



Калгасьніці на уборачнай кампаніі.

ЗАХАВАЦЬ УРАДЖАЙ

БССР павінна ўбраць у гэтым годзе 1.175 тыс. гэкт. збожжавых яравых. Апошні тэрмін уборкі яравых — 5 верасьня. Паўднёвыя раёны БССР павінны былі скончыць уборку збожжавых яравых яшчэ 25 жніўня.

Між тым, на 25 жніўня ў паўднёвых раёнах убрана ўсяго 72 проц. яравых пасеваў. Толькі адзін ПАРЫЦКІ раён поўнасьцю скончыў уборку. Набліжаецца да выкананьня заданьня Чырвонапольскі раён—92,8 проц., Любаньскі — 87,3 проц., Бабруйскі—85, 6 проц.

Рад паўднёвых раёнаў, як Чырвонаслабодзкі, Чачэрскі, Тураўскі, Камарынскі і Жыткавіцкі ЯШЧЭ НЯ ЎБРАЛІ НАВАТ І ПАЛОВЫ ЯРАВЫХ ПАСЕВАЎ.

Цэнтральныя раёны павінны скончыць уборку яравых не пазьней 1 верасьня. Засталося ўсяго 2 дні. Між тым, каля паловы пасеваў яшчэ ня ўбрана. У Бярэзоўскім, Плешчаніцкім, Мсьціслаўскім і Менскім раёнах ня ўбрана нават 1 30 проц. пасеваў. Толькі БЫХАЎСКІ і БЯРЭЗІНСКІ раёны ўбралі: першы—88 1 другі 85 проц. сваіх пасеваў. Рэшта значна адстае

Яшчэ горш справа ў паўночных раёнах. Праўда, яны павінны скончыць уборку яравых не пазьней 5 верасьня. Але сучасныя тэмпы ўборкі не забясьпечваюць свячасовага выкананьня заданьня. Убрана ўсяго 37,2 проц. пасеваў

У радзе раёнаў назіраецца вялікі разрыў паміж уборкай яравых і звозкаю іх у гумны. Гэта пагражае панізіць якасьць ураджаю. Часта замест складаньня ўбрана збожжа ў копы, яно раскідана паасобнымі снапамі па ўсім полі і прарастае

ТАКОЙ БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦІ І ШКОДНІЦТВУ ТРЭБА ПАКЛАСЬЦІ КАНЕЦ.

Трэба зараз усімі мерамі фарсаваць як уборку, так і вывазку ўжо ўбранага збожжа ў гумны.

Ні ў якім разе нельга дапусьціць, каб збожжа заставалася раскіданым па ўсім полі. Вінаватых у гэтым неабходна прыцягваць да судовай адказнасьці.

ТРЭБА БЕЗАДКЛАДНА АРГАНІЗАВАЦЬ КЛАДКУ ЯРАВЫХ У КОПЫ. Толькі такім чынам мы захаваем ураджай і зьменшым страты

Яравыя пад пагрозай

Калгасам „КІМ“ і „Новы сьцяг“ трэба дапамагчы арганізаваць працу

У калгасе «КІМ», Карыцянскага сельсавету, Асіпавіцкага раёну, уборка ўраджаю пад пагрозай зрыву. На сёнешні дзень у калгасе яшчэ ня скошана 40 гэкт. сенажаці. 100 коп гатовага сена ня зьвезены ў гумно і ўжо пачалі гніць. Ляжыць нявубраным таксама жыта і яравая пшаніца. Ячмень амаль увесь ужат, але не павязаны ў снапы і ўжо пачынае гніць. Авёс яшчэ ня ужат. 2 гэктары ільну ня ўбраны.

Галоўнай прычынай зрыву ўборачнай кампаніі ў калгасе зьяўляецца тое, што ён гаспадарча зусім не ўмацаваны. Праца ў калгасе не арганізавана, калгасьнікі не разьбіты па брыгадах. Пра зьдзельшчыну ў калгасе нават і ня ведаюць.

Паміж калгасьнікамі ўвесь час грызьня і сялкі.

Сельсавет і парт'ячэйка ніякай дапамогі калгасу не аказваюць.

У калгасе «НОВЫ СЬЦЯГ» сенажаць таксама яшчэ ня скошана, ня ўбран і ячмень. Уліку праробленай працы і запісу працадзён у кніжкі калгасьнікаў не вядзецца.

Гэтыя факты гавораць за тое, што Асіпавіцкі райкалгассаюз амаль не аддае ніякай увагі гаспадарчаму замацаваньню калгасаў і арганізацыі працы ў іх.

Каб убраць ураджай у калгасах «КІМ» і «Новы Сьцяг», неабходна ў тэрміновым парадку рэарганізаваць там усю работу, разьбіўшы калгасьнікаў на брыгады і прымацаваўшы кожную брыгаду да пэўнай галіны работы.

Без уліку на можа быць зьдзельшчыны, таму першачарговая задача — наладзіць правільны ўлік працы ў гэтых калгасах.

Райкалгассаюз павінен ім дапамагчы.

ГОЦІН.

Ударны дэкаднік па ліквідацыі прарываў

НАРОЎЛЯ. З 25-га жніўня па 5-га верасьня РК КП(б)Б абвешчан ударны дэкаднік па ліквідацыі прарываў у правядзеньні калектывізацыі, уборачнай кампаніі, укараненьні зьдзельшчыны і правядзеньні асеньняй сяўбы.

Для гэтай мэты мабілізавана 22 чал. партыйнага актыву і 10 чал. камсамольскага. Прафсаюзная арганізацыя стаіць у баку ад дэкадніка. Райпрафсавет не паслаў ніводнага чалавека, матывуючы тым, што няма людзей.

На час дэкадніка створаны брыгады лепшых калгасьнікаў для работы сярод аднаасобнікаў, бедняко ў і серадняко ў па ўцягненьні іх у калгасы. У выніку назіраецца прыліў у існуючыя калгасы. У калгас імя Сталіна ўлілося 12 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, у вёсцы Ліхаўні арганізаваўся новы калгас.

Перадавыя калгасы скончылі ўборачную і бяруць на буксір адстаючыя калгасы. Калгас «Чырвоны Цешкаў» першым скончыў падлік даходаў і арыентовачна правёў разьмеркаваньне іх.

30-га жніўня адбудзецца зьлёт калгаснага актыву, які падагуліць працу па ўвядзеньні зьдзельшчыны і вызначыць рад практычных мерапрыемстваў па далейшай рабоце арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў.

Баброў.

12,9 проц. пляну

ЛЁЗНА. У раёне сяўба азімых павінна скончыцца 1 верасьня. Між тым калгасамі і аднаасобнікамі на 22 жніўня засеяна толькі 12,9 проц. пляну. Саўгасы яшчэ не прыступілі да сяўбы.

Райвэ і райкалгассаюз зрэдка кіруюць ходам сяўбы і нават ня маюць пастаянных вестак аб ходзе асеньняй пасеўнай кампаніі. МТС ня прымае ніякіх мер, каб забясьпечыць раньні пасеў у калгасах, якія яна абслугоўвае. Дырэктар МТС таў. Сялізнаў кажа: «Наша справа толькі падрыхтаваць глебу, а да сяўбы мы ня маем ніякага дачыненьня».

Райпартарганізацыя павінна прыняць меры па разгортваньні сяўбы азімых і не дапусьціць зрыву раньняга пасеву.

АСОТА.

Убраць 45 гэкт. махоркі

Ні адзін гэкт. не павінен застацца ў полі

СЛУЦАК. (Наш кар.). Калгасы Слуцкага раёну ў гэтым годзе засеялі 50 гэкт. махоркі. Увесь пасеў закантрактаваны райкаапсаюзам. Ураджай 1 якасьць махоркі ў Случчыне, паводле заключэньня спэцыялістаў, ня ўступае украінскай махорцы. Кожны гэктар у сярэднім павінен даць 3-4 тоны таварнага сырцу.

Зараз трэба ўдарнымі тэмпамі разгарнуць уборку махоркі, бо дрэннае надвор'е можа панізіць якасьць ураджаю. Між тым, большасьць калгасаў з уборкай махоркі не сьпяшаецца. З 50 гэкт. убрана ўсяго 5. Райкалгассаюз і райкаапсаюз таксама вельмі мала аб гэтым клапоцяцца і ніякіх указаньняў калгасам не даюць

Неабходна разьбіць сьцяну коснасьці і недаацэнкі ўборкі высокакаштоўнай культуры — махоркі. У бліжэйшыя дні трэба арганізаваць ударную ўборку тытуну. Ні адзін грам махоркі не павінен застацца ў полі.

П. Арцельны.

МНОЖЦЕ

бальшавіцкі пачын парткалектыву БАН

СУЧАСНЫ ЭТАП САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА ПАТРАБУЕ РАШУЧАГА ПАВЫШЭНЬНЯ ІДЭЙНА-ПАЛІТЫЧНАГА ЎЗРОЎНЮ ЧЛЕНАЎ І КАНДЫДАТАЎ ПАРТЫІ І ЎЗМАЦНЕНЬНЯ ІХ КЛЯСАВАЙ СТОЙКАСЬЦІ.

ПАРТЫЙНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ ПАВІННА СТАЦЬ ВАЖНЕЙШАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ ЗАДАЧАЙ, А ПАРТВУЧОБА ВАЖНЕЙШЫМ СРОДКАМ ГЭТАГА ВЫХАВАНЬНЯ.

БЮРО ПАРТКАЛЕКТЫВУ БАН, УЛІЧВАЮЧЫ ВАЖНАСЬЦЬ ПАРТЫЙНАЙ ВУЧОБЫ, ПАСТАНАВІЛА: УСІХ НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ, АСЬПІРАНТАЎ - КАМУНІСТАЎ У ЛІКУ 125 АСОБ ПРЫМАЦАВАЦЬ ДА ФАБРЫК, ЗАВОДАЎ І НОВАПАБУДОЎ ДЛЯ ДАПАМОГІ ПРАПАГАНДЫСТАМ І ДЛЯ ВЯДЗЕНЬНЯ ЗАНЯТКАЎ У ВЯЧЭРНІХ САВЕЦКІХ ШКОЛАХ І Ў ПАЧАТКОВЫХ ПАРТЫЙНЫХ ШКОЛАХ.

БЮРО КАЛЕКТЫВУ ЛІЧЫЦЬ ГЭТА ВАЖНЕЙШАЙ ПАРТЫЙНАЙ НАГРУЗКАЙ, АД ЯКОЙ НЯ МОЖА БЫЦЬ ВЫЗВАЛЕН НІ АДЗІН ТАВАРЫШ, ЯКУЮ-Б ПРАЦУ ЁН НЯ ВЫКОНВАЎ.

БЮРО КАЛЕКТЫВУ ЗВАРАЧАЕЦЦА ДА ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ІНШЫХ НАВУКОВА - ДАСЬЛЕДЧЫХ І НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ З ЗАКЛІКАМ ВЫЛУЧЫЦЬ НА ПРАЦУ Ў СЕТЦЫ ПАРТАСЬВЕТЫ ПА ПРАДПРЫЕМСТВАХ УСІХ БОЛЬШ НАДРЫХТАВАНЫХ І ВЫТРЫМАНЫХ ЧЛЕНАЎ ПАРТЫІ, У ПЕРШУЮ ЧАРГУ ЎСІХ СТАРЫХ КАМУНІСТАЎ.

ВЫХАВАНЬНЕ МАЛАДЫХ ЧЛЕНАЎ І КАНДЫДАТАЎ ПАРТЫІ Ў ДУХУ БАЛЬШАВІЦКАЙ ПАРТЫЙНАСЬЦІ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА САМЫМ ГАНАРОВЫМ АБАВЯЗКАМ І НА ГЭТУ ПРАЦУ ПАВІННЫ БЫЦЬ КІНУТЫ ЛЕПШЫЯ СІЛЫ ПАРТЫІ.

БЮРО ПАРТКАЛЕКТЫВУ.

1-га верасьня склікаецца

чарговы пашыраны Пленум Менскага Гаркому КП(б)Б

з удзелам членаў бюро парткалектыву, і ячэек КП(б)Б, дырэктароў прадпрыемстваў, старшынь фабзаўкомаў (партыйцаў), сакратароў сельпартклюбаў і сельячэек КП(б)Б з наступным парадкам дня:

1. Вынікі перавыбараў бюро ячэек і далейшыя задачы партарганізацыі. (Дакл. тав. КВАЛЬЧУК).
2. Папярэднія вынікі ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі і далейшыя задачы па арганізацыйна-гаспадарчым узмацненьні сяўгасаў і калгасаў. (Дакл. тав. КАРАНЕЎСКІ).

Пленум адкрываецца ў 6 гадзін вечара, памяшканьні Дому Камасьветы (б. клюб Карла Маркса).

Члены ЦК КП(б)Б, члены Пленуму Гаркому і рэвіз. камісіі ўваходзяць па сваіх пасьведчаньнях, а іншыя—па білетах Гаркому, якія сакратары яч. павінны атрымаць у Гаркоме.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

СІЛАС

37.000 кбм

ям і траншэй пустуюць

Саўгасы БЕЛСАЎГАСТРЭСТУ павінны пабудаваць 127. 500 кбм сіласных веж, ям і траншэй. На 25 жніўня пабудавана ўсяго 46.754 КБМ. — 36 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ.

За перыяд чэрвень-жнівень закладзена 4.493 тон сіласу, што складае 10.8 ПРОЦ.

37. 758 КБМ. СІЛАСНЫХ ВЕЖ, ЯМ І ТРАНШЗЭЙ ДАГЭТУЛЬ НЕ СКАРЫСТАНЫ. Нездавальняюча ідзе і ўборка сіласных культур. З 1.186 гэкт. убрана ўсяго 298 — 25 проц.

Такія саўгасы, як «Калініна» (племгас), «Прылукі», «Тарасава», «Смалявічы», «Бесяднова», «Дусінічы», «Камарынскі», «Доўгалесьсе», (малочныя мы), «Самуэлева», «Караліёва», «Сотова», «Рачкавічы», «Капацэвічы», «Менск» і «Рудакова» яшчэ не пачыналі сіласаваньня.

Між тым, сілас у кармовым балансе гэтых гаспадарак будзе адыгрываць значную ролю. Зрыў сіласаваньня ў гэтых саўгасах мы можам разглядаць толькі як грубае ігнараваньне дырэктыў партыі і ўраду, як спробу апартуністаў сарваць стварэньне моцнай кармовай базы.

Мы патрабуем прыцягненьня да адказнасьці дырэктараў гэтых саўгасаў

Саўгасы «Чэрыкаў», імя XVI партзьезду (Клімавіцкі раён), «Дзядзелава пашкова» (Аршанскі раён), «Халоўе» (Дубровенскі), «Стала-Беліца» (Уваровіцкі), імя 14 партызан, «Старчыцы» імя Будзённага (Чэрвенскі), «Горкі-Абчак» і «Беларусь» ДА СІЛАСАВАНЬНЯ ЯШЧЭ ЗУСІМ НЕ ПРЫСТУПІЛІ.

Ход сіласаваньня па саўгасах Свінаводу ня зрушыўся ўперад. На 20 жніўня пабудавана сіласных веж, ям і траншэй 17.063 КБМ. — 24,5 проц. пляну.

Засіласавана 2.949 тон, што складае 8,5 проц. заданьня

Такім чынам 11.165 кбм ужо гатовых веж, траншэй і ям пустуюць, ня гледзячы на тое, што сіласная маса ёсьць у саўгасах у выстарчальнай колькасьці.

Аб'яднаны рэйд брыгад „Правды", „Зьвязды"

ПРАЗ ДЗЕНЬ ПАЧНЕЦЦА ВУЧОБА

БЕЛКААПСАЮЗ, КАЛГАСЦЭНТР, БДВ НЯ ВЫКАНАЛІ ДЫРЭКТЫЎ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ

У мінулым годзе... далі дырэктыву

Калгасцэнтр і НКСВ трэба адносьці да ліку тых установаў, якія абыходзяць падрыхтоўку да навучальнага году, як лічыць патрэбным заняцца гадзін-6 абкладнымі гэтага пытаньня.

Калгасцэнтр у мінулым годзе даў дырэктыву райвыканкамам аб удзеле ў выпадковых пасад і школьным будаўніцтве. Гэтая дырэктыва, выказаньне якой, як рэчы, не правалася, даўно забыта нават і самім Калгасцэнтрам. Аб ёй работнікі Калгасцэнтру напэўна і ня ўспомняць, калі-б ня прыйшлося давець адказы на пытаньні брыгад.

Калгасцэнтр усёй не займаўся пытаньнем культурнага будаўніцтва і ў прыватнасьці падрыхтоўкай да навучальнага году ў раёнах суцэльнай калектывізацыі. Ён ня ведае, у якой меры забясьпечаны школы навучальнымі, ці ня, як забясьпечаны дзеці калгаснікаў вопратай, абуткам, харчаваньнем у гэтых раёнах.

Да гэтага часу не аформлена перадача пад ведамы Калгасцэнтру 7 с.-г. тэхнікумаў. Гэтыя тэхнікумы зараз без гаспадароў. Яны ня змогуць пачаць сваячасова заняткаў з тае прычыны, што не праведзена работа па вярбоўцы студэнтаў, ня вырашана пытаньне аб памяшканьнях пад аўдыторыі, інтэрнаты.

Заключаны паміж Калгасцэнтрам і НКАсьветы дагавор пікоці на правяраўся.

У сьніку гутарні брыгады з работнікамі Калгасцэнтру прыходзіцца, на жаль, канстатаваць, што гэтая установа стаіць у бяку ад правядзеньня дырэктыў партыі ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Брыгада «Правды», «Зьвязды» і «Савецкай Беларусі»:

РАМАНЕНКА, ІВАНОЎСКАЯ, ГУРСКІ

Падручнікі ўсё яшчэ вандруюць

Беларускае дзяржаўнае выдавецтва павінна было выдаць да пачатку навучальнага году 83 падручнікі. Выйшла 25. Для рабочых вечарніх школ трэба было выдаць 10, выдана 3, для школ малапісьменных трэба выдаць 3, выдан 1.

Большая палова падручнікаў вандруе па ўстановах выдавецтва, стыльрэдакцыі, друварні, мэтадкоме і галоўліце.

Тэхнічнае афармленьне падручнікаў, нездавальняючае. Пераплёт слабы, найчасьцей заныкаюцца літары.

Зусім дрэнна справа з падручнікамі для нацыянальных школ. Амаль усе ўкраінскія падручнікі знаходзяцца ў друку, літоўскія і латыскія зусім ня друкуюцца.

Партыйная ячэйка БДВ не заялася за ліквідацыю гэтага прарыву. Яна вынесла некалькі пастаноў, але забылася (?) іх выканаць.

Камсамольская арганізацыя БДВ займалася толькі размовамі і жаніцьбаваньнем такой прычынай, як недахоп паперы.

Саюзтранс працуе ня лепш БДВ. Цэлымі тыднямі ўнакаваныя падручнікі валяюцца на балах і пагрузачнай раме.

Выданьне масавай літаратуры да падрыхтоўкі да новага навучальнага году зусім сарвана.

Трэба сурова пакараць тых работнікаў з БДВ, па віне якіх зрываецца выданьне падручнікаў.

Брыгада «Правды», «Зьвязды» і «Савецкай Беларусі»: Данілевіч, Папінскі, Галкіна, Тэраўскі.

Аматары самацёку

Па Ляськаўскім сельсавеце Талачынскага раёну, будаўніцтва і рамонт школьных памяшканьняў праходзяць надзвычай марудна.

Навапруднская школа, напрыклад, будуецца ўжо 3-ці год. Па віне сельсавету марудна ідзе будаўніцтва В.-Зубаўмонт Зялёнгайскай 3-гімназіяльнай монт Зялёнгайскай 3-гімназіяльнай школы. Ва ўсіх школах не хапае абсталяваньня. Лаўкі для школ заказаны толькі 20 жніўня. Сенью не клапоцяцца аб забясьпечаньні школ падручнікамі і пісьмовымі прыладамі. Так, калі было завезена некалькі скрынак пісьмовых прылад і спытаў, праўленьне сельпо распарадзілася прадаваць гэтыя спытні ўсім. Хата-чытальня, якая існуе пры сельсавеце, ня ўключылася ў работу па падрыхтоўцы да навучальнага году.

Парт'ячэйка не займалася падрыхтоўчай работай і не кіравала гэтай справай. Ляськаўская камсамольская ячэйка не апраўдвае званьня шэфа ўсёагульнага навучаньня. Сацдагавор, які заключыла ячэйка з асьвеціцелямі, ня выканан. Трэба рашучае ўдзярыць на аматарах самацёку і забясьпечыць пераход у падрыхтоўцы да навучальнага году.

УПАРТЫ.

Павярнуць спажыўкаапэрацыю тварам да школ

СТАРОБІН. Школы Старобінскага раёну вопраткай і гарачым сьнеданьнем не забясьпечаны. Спажыўсаюз тварам да школы не павярнуўся. Ён лічыць «дробязьзю» тое, што патрэбна 60 кінцільнікаў, 2.000 кубкаў, шмат вопраткі і абутку.

Рашей на складах спажыўсаюзу было шмат прылад, якія можна скарыстаць для абсталяваньня школьных шалітэхнічных пакояў, але іх прадалі сялянам.

Работнік райвыканкарыяту нарасьветы тав. Падольскі яшчэ толькі «думае» зрабіць заказ Белкаапсаюзу на школьныя прылады і абсталяваньне майстэрань.

Па Мазурскім сельсавеце школы для заняткаў не падрыхтаваны, рамонт ня скончан. Дом Сацыялістычнай Культуры будуецца 4 гады і зараз ня скончан толькі таму, што не хапае сродкаў. Будаўнічыя матар'ялы ёсьць у выстарчальнай колькасьці. Патрэбна выставіць такія арганізацыі як спажыўкаапэрацыя і іншыя павярнуцца ўрошце тварам да школ.

Брыгада «Зьвязды».

ДЗІЦЯЧЫ АБУТАК І ВОПРАТКА

ў патрэбнай колькасьці ў раёны

НЕ ЗАВЕЗЕНЫ

Работнікі БКС—Сулькіна і Каждан—канкрэтныя віноўнікі зрыву

Штурмавой работай ліквідаваць прарывы!

БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ ПАРТ'ЯЧЭЙКІ НКА—АДНА З ПРЫЧЫН ПРАРЫВУ

Факты, якія выявіла наша брыгада пры абсьледваньні НКА па пытаньнях падрыхтоўкі да навучальнага году, засьведчываюць асаблівай увагі.

Паводле пляну НКА ў гэтым годзе намечана пабудаваць 277 новых школьных будынкаў і скончыць пабудову 300 школ, пачатых у папярэднія гады. З намечаных 277—60 яшчэ не распачаты. Такія марудныя тэмпы тлумачацца тым, што адсутнічае персональная адказнасьць за школьнае будаўніцтва, а галоўнае, шмат якія раёны недоацанілі значэньня школьнага будаўніцтва, выкарыстоўвалі будаўнічы матар'ял не па прызначэньні (Мажскі гарсавет, Дрысьненскі раён і г. д.). Асабліва нядбайна адносіцца да школьнага будаўніцтва Белкаапсаюз, які павінен быў унесьці на гэту справу каля 1 млн. руб., але-ж на 1-га жніўня нічога ня ўнёс. Дрэнна стаіць справа школьнага будаўніцтва ў Ельскім, Буда-Кашалёўскім, Веткаўскім, Крычаўскім, Старобінскім раёнах.

Ня лепш абстаіць справа з забясьпячэньнем школ педагагічнымі кадрамі. Першы канцэнтр настаўнікамі поўнасьцю ня будзе забясьпечан.

Другі канцэнтр у такім-жа становішчы. Асабліва вялікі недахоп адчуваецца ў пэдкадрах па школах нацменшасьцяй. У яўрэйскіх школах не хапае 25 настаўнікаў, расійскіх—12, польскіх — 25, нямецкіх — 12.

Шэф усенавучу — ЛКСМБ—ня выканаў свайго абавязацельства па мобілізацыі 1000 членаў ЛКСМБ у пэдустановы. Процант курсантаў - камсамольцаў на кароткa-тэрміновых курсах дасягнуў усяго 39.

Вытворчыя праграмы па палітэхнізацыі для першага і другога канцэнтраў не падрукаваны.

Ячэйка КП(б)Б НКА зусім не кіравала справай падрыхтоўкі да навучальнага году. У пляны ячэйкі былі ўключаны амаль усе пытаньні ўсёагульнага навучаньня, але... за мінулыя два месяцы ня было ніводнага сходу, ня было пасяджэньня бюро.

Апартуністычная бязьдзейнасьць бюро ячэйкі аб'ектыўна садзейнічала стварэньню прарываў на асобных вучастках падрыхтоўкі да навучальнага году. Кіраўніцтва парт'ячэйкі павінна быць прыцягнута да партыйнай адказнасьці.

Брыгада «Правды», «Зьвязды» і «Савецкай Беларусі»:

Аляшкевіч, Бір, Каган, Мерголіна, Гордон, Сапаеў, Бакарэвіч, Галінкевіч.

Справа вырашаецца...

У трэцім квартале Белкаапсаюз павінен накіраваць у раёны 96.780 пар абутку, дасланa-ж усяго 8.543 пары, што складае 8,7 проц. пляну.

Абутковая фабрыка «Кастрычнік», якая зьяўляецца асноўным заганоўцам абутку для дзяцей школьнага ўзросту, у трэцім квартале выканала плян на 41,2 проц. Вопратка павінна быць адгружана вясковаму сэнтэру на 800 тыс. руб. і гораду — на 269 тыс. руб.

Загадчык аддзелу гатовай вопраткі, тав. Супькіна ня мае ні адной згоды аб адгрузцы гатовай вопраткі для школ. Яна апраўдваецца тым, што «мы ніколі прадпрыемствам, каб яны дасылі нам вестні, далі ім разнарадкі, а чаму яны не адгружаюць, мы ня ведаем і не адказваем(?) за іх».

Белкаапхарч зрывае арганізацыю гарачых сьнеданьняў. Трэба набыць 1.540 катлоў, набыта — 171; кінцільнікаў патрэбна 4.000, ёсьць — 565; кубкаў патрэбна 540 тыс., а дасланa — 2.500; чайнікаў патрэбна 600 тыс., ёсьць — 300 штук; лыжак — 540 тыс., ёсьць 2 тыс., місак — 540 тыс., ёсьць 36.340 штук.

Для гарадоў адпушчана сьнеданьне на 43.590 чал., выраблена готага адпускаецца цукру, гарбаты і хлеба на 46.250 чал. На мясцох-жа ў гэтым напрамку нічога ня зроблена.

Для арганізацыі гарачых сьнеданьняў па вясковых школах патрэбна 97,2 тоны цукру. Нічога выкуп не адпраўлецца. Загадчык прадуктовага сэнтэру Белкаапсаюзу тав. Кандратоўскі яе даведку, што «справа з цукрам для школ вырашаецца».

Бюро парткалектыву Белкаапсаюзу пытаньнем падрыхтоўкі да новага навучальнага году не займалася. Сакратар парткалектыву тав. Нісэнбаўм заявіў: «Мы гэтым пытаньнем зусім не займаліся, і займацца няма часу, бо ёсьць больш важныя справы».

Усё гэта гаворыць аб тым, што сыгналы газеты «Зьвязда» ня турбуюць особных гора-работнікаў Белкаапсаюзу.

Брыгада «Правды», «Зьвязды» і «Савецкай Беларусі»:

НАРКО, ПЯЛІНСКІ, МУРАВЕЙКА, КУДАНАЎ, АЛЬТШУЛЕР І ГІНЕНСКІ.

Сарвалі падрыхтоўку

Па горадзе і Менскім раёне дзяцей школьнага ўзросту налічваецца каля 25.000 чалавек. З-за адсутнасьці памяшканьняў пімат вучняў застануцца неахопленымі школамі. Да 1.000 квадр. мэтраў школьнай плошчы ёсьць прыватнымі жыхарамі і ўстановамі, якія да гэтага часу гарсаветам ня выселены.

Для пабудовы школ на Серабранцы адпушчана 100 тыс. руб., скарыстана толькі 36 тыс. руб. Пабудова спынецца з-за адсутнасьці матар'ялаў.

Па раёне патрэбна будаваць 8 памяшканьняў, але пікоўдзіта ня будуецца. Рамонт ня скончан. У Навадворскім і Карэнічанскім сельсаветах кулацкія будынкі не перадалы пад школы. Кайкаўскі сельсавет ужо 6 год будуе школу.

Плян падрыхтоўкі пэдагагічных кадраў менскім гарНА выкананы на 60 проц. Замест 30 асоб на пэдагагічныя курсы прыйшла 30. Па Менскім раёне не хапае 34 чал. настаўнікаў.

Падручнікамі, за выключэньнем першай і другой груп, школы не забясьпечаны. Для зуплавых груп няма ніводнага падручніка. Пісьмовымі прыладамі (спытамі, алоўкамі) школы забясьпечаны на паўтара месяца.

Рабочыя пакоі і майстэрні прыладамі не пакоўнены.

На 18 тыс. вучняў гораду і 6.200 — раёну атрымана ўсяго 3 тыс. пар абутку, што складае 30 проц. пляну. Такое-ж становішча і з вопраткай. Развозмер вопраткі вельмі малы, максымум — на 12-13 год. Якасьць дрэнная.

4 школы па горадзе зусім не забясьпечаны харчаваньнем. На дадзеную бяднейшым вучням і арганізацыю гарачых сьнеданьняў будзе адпушчана 70 тыс. руб.

Палітэхнічным абсталяваньнем школы забясьпечаны на 1 проц. ЦП сакзу працадасьветы мае запазычанасьць па пелітэхнічным абсталяваньні ў 25 тыс. руб. Шмат школ ня мае школьнай мэблі. Толькі ў 5 школах ёсьць рабочыя лавы.

Каб забясьпечыць усе школы лавамі, патрэбна 11 тыс. кбм. дроў. Пікульнага закуплена 400 тон торфу, які гэтага часу ня вывезены.

Камсамольскія арганізацыі гораду свайго абавязацельства ня выканалі. Пастанова ЦК ЛКСМБ аб мабілізацыі 25 камсамольцаў у пэдустановы ня выканана. З-за бяздзейнасьці ў гэтым напрамку ГК ЛКСМБ сарваны набор студэнтаў у тарфяны інстытут, аўтадарожнікум, політэхнікум, бібліятэчны, дашкольныя курсы і музычны тэхнікум.

Дрэнна абстаіць справа з арганізацыяй грамадзкага харчаваньня ў середніх навучальных установах. У аўтадарожнікуме нават быў абвараны сталовка. Студэнты вельмі часта скарджацца на дрэнную якасьць харчаваньня.

Паданыя факты гавораць аб тым, што гарсавет, парком ЛКСМБ не адклі патрэбнай увагі падрыхтоўчай рабоце. Замест працяжнення ўдарнай падрыхтоўкі да новага навучальнага году, ён яе сарваў.

Брыгада «Зьвязды», «Правды» і «Савецкай Беларусі»:

ПЛІСЮ, СІНЯК, ЗАКРОЎСКІ, КАПЛАН.

Слова за пракуратурай

Хойніцкая ШКМ рыхтуецца распачаць навучальны год без памяшканьня, бо РВК перадаў будынак, які належыць ШКМ, райвыканкаму. Праўда, РВК перадаў ШКМ два куланцкія дамы, але яны такома заняты. Трэба адзначыць, што ні ВВК, ні РСІ, ні інспектар не адносіць патрэбнай увагі ШКМ.

Да гэтага часу ШКМ без памяшканьня. Балай у такім-жа становішчы Варацейская і В.-Берская школы.

Слова за пракуратурай.

Будзько.

САМПРАМКААПЭРАЦЫЯ

ЗАДАЧЫ НОВЫЯ,

мэтады работы СТАРЫЯ

Дапамагчы сампрамкаапэрацыі БССР рашуча перабудавацца

(НА НАРАДЗЕ ПРЫ „ЗЬВЯЗЬДЗЕ")

Прамысловая каапэрацыя БССР, пад кіраўніцтвам партыі, дабілася ўжо значных посьпехаў. Вынікі работы за мінулыя два з паловай гады паказалі, што роля прамкаапэрацыі ня толькі ня зьніжаецца, але значна павялічваецца. Самы факт выпуску сыстэмай Белпрамсаюзу ня першае паўгодзьдзе 1931 году прадукцыі на 50 млн. руб. красамоўна гаворыць аб тым значэньні, якое прамкаапэрацыя БССР можа адыгрываць у разьвіцьці прамысловасьці, сельскай гаспадаркі і ліквідацыі таварнага дэфіцыту. Ужо цяпер удзельная вага саматужных промыслаў у адносінах да дзяржаўнай прамысловасьці БССР складае 29 проц.

Апошнія пастановы ўраду СССР і БССР усклалі на прамкаапэрацыю рад вялізарных абавязкаў. Для рэалізацыі іх патрабуецца перабудова і паляпшэньне работы ўсёй сыстэмы прамсаюзу.

Як-жа беларуская прамкаапэрацыя ажыцьцяўляе дырэктывы ўраду? Гэта пытаньне было пастаўлена на шырокай нарадзе пры «Зьвязьдзе».

Намесьнік старшыні Белпрамсаюзу тав. Фрыд прымушан быў у сваім дакладзе канстатаваць, што прамкаапэрацыя вельмі марудна перабудоўвае свае рады ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі далёка яшчэ не дае ўсяго таго, што яна можа і павінна даць.

—Прамфіцплян—,кажа т. Фрыд,—выконваецца нездавальняюча, а ў некаторых галінах—дрэнна. Адным з важнейшых якасных паказальнікаў работы ўсёй прамкаапэрацыі зьяўляецца ўмелае выкарыстаньне мясцовага недэфіцытнага сырцу. Але якраз на гэтым вучастку ёсьць буйныя прарывы. За мінулыя два кварталы на групе промыслаў, якія працуюць на мясцовым сырцы, гадавы плян выкананы на 32,2 проц., а на другой групе,—якая працуе на завозным сырцы—на 42,1 проц. У сярэднім гадавы плян выкананы на больш як на 36 проц. Значны прарыў ёсьць якраз у найбольш важных і ўдарных промыслах. Ня выконваецца прамфінплян нават на такіх артэлях, як «Чырвоны абутнік», якія звычайна перавышалі заданьне.

У чым-жа карэньні прарываў? Нарада высьветліла, што гэтыя карэньні ў першую чаргу крыюцца ў самой сыстэме работы прамкаапэрацыі. Умовы работы прамкаапэрацыі, як і ўсёй прамысловасьці, рэзка зьмяніліся. Абстаноўка зусім іншая, а прыёмы работы, прыёмы кіраўніцтва прамкаапэрацыйных арганізацый, амаль не зьмяніліся. Адсюль і толькі адсюль у асноўным ідуць карэньні прарываў. Тэмпы перабудовы чарапашыя. Прамова тав. Сталіна не знайшла належнага адбітку ў рабоце прамкаапэрацыйнай сыстэмы. Моманты апартуністычнай практыкі, ненаваротлівасьці, яшчэ далёка ня выкарчаваны ў практыцы пасобных зьвеньняў прамкаапэрацыі.

Арцелі, у тым ліку і ў Менску, амаль нічога не зрабілі, каб палепшыць такую важную справу, як абслугоўваньне заказчыка і выкарыстаньне яго сырцу. Заказчык павінен чакаць па некалькі месяцаў, пакуль арцель выканае заказ на гарнітур, паліто і г. д. Не аддаецца ўвагі максымальнаму выкарыстаньню ўцілю і адыходам. У дрэваапрацоўчых арцелях, напрыклад, можна было-б выкарыстаць адходы дрэва для выпрацоўкі лыжак, але нічога ня робіцца. Тут выяўляецца коснасьць, непаваротлівасьць з боку раду работнікаў сыстэмы.

Пытаньні гаспадарчага разрахунку, зьдзельшчыны, якасьці прадукцыі, паляпшэньня бытавых умоў арцельшчыкоў, укараненьня тэхнікі ў арцелі ня сталі ў цэнтры ўвагі прамысловай каапэрацыі. У арцелі ўцягнута ўсяго 1-2 проц. жонак арцельшчыкаў. Ёсьць рад арцеляў, дзе існуе яшчэ пачасовая аплата. Прагрэсыўная зьдзельшчына ня ўведзена. Сыстэма аплаты, якая існуе ў арцелях, не стымулюе ўзьнікцця працадукцыйнасьці працы і ня спрыяе замацаваньню на вытворчасьці кваліфікаваных кадраў. Прамкаапэрацыя яшчэ не зрэалізавала ўрэшце ня ўніўзіцца ў апарат працы. Гаспадарчы разрахунак не ўкараніўся яшчэ ў кожнай арцелі. Самы часта забываюць, што плянуючы і накіроўваючы работу арцеляў, яны абавязаны даць здаровым арцелям максымум самастойнасьці весьці сваю вытворчасьць, самастойна мазаўраваць сваімі сродкамі. Гаспадарчы разрахунак патрабуе ад сакзаў і арцеляў скансцэнтраваньня ўсёй сваёй увагі на выкананьні колькасных і якасных паказальнікаў, праверкі выкананьня рублём.

Культурна-бытавое абслугоўваньне арцельшчыкаў найбольш слабы вучастак. Ні ў адной арцелі няма ясьляў. Пытаньні грамадзкага харчаваньня, паляпшэньня забясьпячэньня таксама ня сталі ў цэнтры ўвагі прамыслова-каапэрацыйных арганізацый.

З 1-га верасьня павінны распачаць работы новарганізаваныя галінавыя аб'яднаньні Белпрамсаюзу. Але да гэтага часу аб'яднаньні, асабліва па будматар'ялах, не ўкамплектаваны тэхнічна-вытворчымі кадрамі. Замест 20 магазынаў раздробнага гандлю, па БССР адкрыта ня больш 5.

Мерапрыемствы вызначаныя партыяй і ўрадам у галіне разьвіцьця прамысловай каапэрацыі, могуць быць выкананы толькі пры дапамозе ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый.

На жаль некаторыя цэнтральныя і раённыя арганізацыі недаацэньваюць і не разумеюць значэньня разьвіцьця прамкаапэрацыі і часта нават перашкаджаюць ёй разгортваць работу.

Т. т. Мэбэль, Пукліна, Шульц, Сорын, Курчынскі, Валожын, Галкін, і інш., якія выступалі ў спрэчках па дакладзе тав. Фрыда, пацьвярджалі гэта шматлікімі фактамі. У Брагіне РВК адабраў у саматужнікаў клюб, а ў Парычах, такім чынам, спынілі работу прафтэхшколы прамсаюзу. У Бульскім раёне арганізавана 7 тарфяных арцеляй, але ні адна з іх не зацьверджана РВК. Члены Антосінскай тарфяной арцелі, у самы разгар работы былі перакінуты сельсаветам на працугужпавінасьць. Менск адчувае вялікую патрэбу ў прадукцыі. Камгас ня толькі не дапамагае, але фактычна сарваў гэту важную справу. Камгас прадставіў прамсаюзу пагрэльню два хлявы па Кальварыі, а калі прадстаўнікі прамсаюзу паехалі на месца, дык аказалася, што гэтыя будынкі забраніраваны за Калгасцэнтрам. Па Менску павінна быць адкрыта 5 раздробных прамкаапэрацыйных магазынаў. Гарсавет і камгас ня толькі не дапамагаюць, але выкідваюць з некаторых памяшканьняў арцелі і аддаюць іх пад магазыны спажыўкаапэрацыі. У арцелі імя Фрунзе ня выйшла на работу цэлая зьмена. Аказалася, што ўся яна працуе на заводзе «Беларусь». Арцелі звальняюць прагульшчыкаў і лятуноў, а некаторыя прадпрыемствы іх залічваюць на работу і даюць павышаную стаўку. Наркамспаб, Белкаапсаюз ігнаруюць патрабаваньні прамкаапэрацыі, не аддае ёй належнай увагі і друк.

Зразумела, што такія недапушчальныя адносіны з боку пасобных цэнтральных і раённых арганізацый да прамкаапэрацыі ня могуць садзейнічаць выкананьню ёю сваіх задач.

Аднак у выступленьнях работнікаў Белпрамсаюзу ўсё-ж было мала самакрытыкі. Газэтчы аб тым, што прамкаапэрацыю «крыўдзяць», ніхто з выступаўшых не сказаў, як калектыва прамнова ўраду да кожнага каапэраванага саматужніка, як перабудоўваецца сыроблена ў барацьбе за якасьць, які ўдзел у перабудове прымае прафарганізацыя Белпрамсаюзу.

Прамкаапэрацыя БССР павінна рашуча ўзяцца за перабудову сваёй работы ў адпаведнасьці з указаньнямі т. Сталіна і задача партыйных, савецкіх і прафесыянальных арганізацый аказаць прамкаапэрацыі практычную дапамогу ў выкананьні ўскладзеных на яе партыяй і ўрадам абавязкаў.

М. К-н.

НА РЫШТАВАНЬНЯХ ІЛЬНАЗАВОДАЎ

45 ІЛЬНАЗАВОДАЎ

ПАВІННЫ ЗАПРАЦАВАЦЬ ПОЎНЫМ ХОДАМ У ТЭРМІН!

ПАКОНЧЫЦЬ З АБЯЗЬЛІЧКАМІ І УРАЎНІЛАЎКАМІ НА БУДОЎЛЯХ!

ЗВОДКА

будаўніцтва ільназаводаў на 20 жніўня

ЗАВОД	Агульны проц. выкананьня будпляну
Вушацкі	39
Межынскі	48
Копыскі	50
Крупскі	77
Ч.-Польскі	60
Гарадоцкі	47
Любаньскі	43
Ветрынскі	48
Хоцімскі	77
Багушэўскі	61
Гарадоцкі	32
Вульскі	47
Высачанскі	27
Бігосаўскі	21
Дубровенскі	51
Лепельскі	44
Хвойніцкі	51
Чашніцкі	28
Сурасскі	40
Горацкі	78
Кармянскі пяльковы	54
Чэрэйскі	23
Талочынскі	57
Кохануўскі	41
Крычаўскі	38
Касьцюковіцкі	52
Бялыніцкі	44
Кармянскі ільняны	48
Церахайскі	28
Уваравіцкі	75
Пухавіцкі	12
Расонскі	44
Асьвейскі	31
Бешанковіцкі	33
Сіроцінскі	53
Крупскі	58
Лідзкі	23
Ошмянскі	21
Чаусскі	49
Мсьціслаўскі	52
Касьцюковічскі тэрмовы	24
Магілёўскі	26
Бабруйскі	26
Рагачоўскі	31
Рэчыцкі	45
Усяго:	43

Матар'ялы аб ходзе будаўнічых работ на ільназаводах БССР, якія мы сёньня друкуем, сыгналізуюць аб тым, што па гэтым важнейшым вучастку яшчэ ня ўзяты ўдарныя тэмпы. Плян выканаць у асноўных вытворчых карпусах выканаць у сярэднім на 52 проц., а агульны плян па заводах — на 43 проц. На некаторых ільназаводах нават першай чаргі тэмпы будаўніцтва ня толькі ня ўзьняты, але нават зьнізіліся. Так, на Вушацкім ільназаводзе, які павінен быць пушчан 20 верасьня, агульны плян выканан на 39 проц. Такі-ж малюнак па Межынскім, Гарадоцкім, Чэрвонапольскім і інш. ільназаводах.

Некаторыя будаўнічыя вучасткі, як Віцебскі, праяўляюць поўную непаваротлівасьць і безадказнасьць у разьмеркаваньні будаўнічых матар'ялаў. На адных пабудовах ляжаць бяз руху такія дэфіцытныя матар'ялы, як цэмэнт, толь у той час, як на другіх, якія знаходзяцца побач, нельга распачаць работы з-за недахвату гэтых матар'ялаў.

На тэмпы будаўніцтва мае значны ўплыў абязьлічка, самацёк, няправільная расстаноўка рабсілы, якія ёсьць на радзе ільназаводаў. Адсутнічаюць канкрэтныя аперацыйныя планы. Слаба пастаўлена культурна-масавая работа. Энтузіязм рабочых, якія разгарнулі на радзе заводаў сацпаборніцтва і ўдарніцтва, ва многіх выпадках не ўзначалены мясцовымі партыйнымі і прафесыянальнымі арганізацыямі.

Некаторыя раённыя арганізацыі ня выконваюць дырэктывы партыі і ўраду аб аказаньні максымальнай дапамогі ў фарсаваньні будаўніцтва і адгараджваюцца ад ільназаводаў. ВСНГ да гэтага часу не рэалізаваў дырэктывы ўраду аб перакідцы 25 кваліфікаваных рабочых для мантажу ільназаводаў. Каапэрацыя не павярнулася тварам да будаўніцтва.

Такое ігнараваньне з боку некаторых раённых і цэнтральных арганізацый ударнага будаўніцтва ставіць пад пагрозу сваячасовы пуск ільназаводаў.

Будаўніцтва ільназаводаў уступае ў саны адказны зрыўны. Трэба прыняць максымум энэргіі і ініцыятывы для забясьпячэньня сваячасовага скончаньня будаўнічых работ. Белільнакананляводбуд павінен прыняць самыя рашучыя меры па зьнішчэньні на пабудовах фактаў безгаспадарчасьці, безадказнасьці. Неабходна фарсаваць адгрузку абсталяваньня на ільназаводы першай чаргі.

Перад партыйнымі, савецкімі і прафесыянальнымі арганізацыямі стаіць баявая задача—ва што-б там ні стала забясьпечыць пуск у вызначаныя тэрміны 45 новых ільназаводаў.

ВЕТРЫНСКІ ільназавод— НА БУКСІР

Забясьпечыць пуск заводу да 1-га кастрычніка

Ветрынскі ільназавод павінен быць пушчан да 1-га кастрычніка. Між тым яшчэ да гэтага часу ня ўзяты ўдарныя тэмпы ў правядзеньні будаўнічых работ. Вытворчы корпус трэба было скончыць яшчэ ў лістападзе, а на 20-га жніўня плян выканан на 87 проц. Шаха для трасты пабудавана на 19 проц. Кантора зусім ня будуецца.

На будаўніцтве не хапае 10 цесьляроў. МТС і Ветрынскі райбуд, замест дапамогі ільназаводу займаюцца перамаўваньнем рабсілы.

Будаўніцтва не забясьпечана матар'ялам. Не хапае 46 кбм. дошак, 1.500 шт. агнятрывалай цэглы, 5 лістоў азбесту, 2-х мяшкоў шамоту і г. д.

Не атрыманы яшчэ лёкамабіль і мантажнае абсталяваньне. Трэст да гэтага часу ня даў указаньняў аб канструкцыі лёкамабіля, з-за гэтага нельга распачаць работу па пабудове фундаманту.

Ветрынскае сельскае спажыўтаварыства зусім не аддае ўвагі забясьпячэньню рабочых ільназаводаў. Сталоўка працуе дрэнна. Адміністрацыя не клапоціцца аб паляпшэньні яе работы.

Ня лепш стаіць справа з культурна-масавай работай.

Ветрынскі ільназавод адносен да ліку ўдарных. Патрэбны рашучыя меры для ліквідацыі гэтых буйнейшых недахопаў, каб забясьпечыць сваячасовы пуск заводу.

КРАЛОЎСКІ, ШАУЦОЎ, ДЗЯМ'ЯНЧОНАК.

У ціскох безадказнасьці і самацёку

У Гарадоцкім раёне будуюцца 3 ільназаводы. Тэрмін пуску іх — 1-е кастрычніка. Аднак, работа праходзіць вельмі марудна. На ўсіх пабудовах назіраюцца шматлікія факты безгаспадарчасьці, абязьлічкі, самацёку.

Адсутнічае плянавасьць у забясьпячэньні матар'ялам з боку ВІЦЕБСКАЙ будаўнічай канторы. На ГАРАДОЦКІМ заводзе ёсьць пішаш цэмэнту ў 8 тон, а ў МЯЖЫ з-за недахвату цэмэнту нельга распачаць мантаж. У БЫЧЫСІЕ ёсьць многа пішняга топю, а ў ГАРАДКУ топю не хапае.

З-за гэтай неразьбярыхі прыходзіцца перакідваць матар'ялы з адзнаго месца ў другое, што выклікае затраты лішніх сродкаў.

Матар,ялы, якія паступаюць сваячасова не выкупляюцца. З-за таго, што загадчык Межынскага саюзу ня выкупіў сваячасова песьчанар'ялаў, на пабудове быў прастой і заплочана 108 руб. начальніку станцыі за прастой. Новая імпартная цэнтрэбіна прапляжала на станцыі 7 дзён. За гэты час хтосьці адрэзаў ад цэнтрэбіны вялікі кавалак пасу, а бяз гэтага пасу машына ня можа быць пушчана ў ход.

Наступ уся работа праходзіць самацёкам, без канкрэтных аперацыйных планаў. У адзін дзень працуе 15 чалавек, а ўдругі — 30 ці 50. На МЕЖЫНСКІМ заводзе рабочыя ня ведаюць сваіх норм выпрацоўкі і разьмеркаў аплаты. Працоўцыйнасьць працы нізкая. Работа, якая павінна выконвацца за 4 гадзіны, цягнецца 8 гадзін.

На ГАРАДОЦКІМ заводзе — яшчэ цікавасьць рабсілы. Прыбыўшыя з Мажы 18 цесьляроў пасьля 3-х дзён работы пакінулі пабудову. Працоўная дысцыпліна ў заняпадзе. За пісьмо на межынскім заводзе было 12 проц. прагулаў. Усё гэта зьяўляецца вынікам слабой культмасавай работы і неналаджанасьці рабочага забясьпячэньня.

Кіраўніцтва пабудоў ня прыняло ніякіх мер для правядзеньня мерапрыемстваў па пажарнай ахове. На пабудове ніхто ніводнага агнятушыцеля. На межынскім заводзе ніхто не адчувае адказнасьці за сваячасовы пуск заводу.

Становішча на ГАРАДОЦКІХ ільназаводах пагражаючае. Райком партыі, гарпрафсавет павінны прыняць рашучыя меры, каб пікіраваць агідзнасьці на пабудовах ільназаводаў.

Кіраўніцтва заводамі павінна безадкладна распрацаваць канкрэтныя планы і абгаварыць іх на агульных рабочых сходах. Нормы і расцэнкі павінны быць даведзены да кожнага рабочага. Трэба абязьсьціць рашучую барацьбу зрыўшчыкам і парушальнікам працоўнай дысцыпліны. У гэтай справе павінна прыняць актыўны ўдзел камсамольская арганізацыя.

КЕРЩТЭЙН.

ДЭЛЕГАЦЫЯ МЕНАПП'У Ў НАРКАМАСЬВЕТЫ тав. ПЛАТУНА

29 жніўня дэлегацыя МенАПП'у ў складзе т.т. ПЯТРУСЯ БРОЎКІ, А. КУЧАРА, В. МАРАКОВА, З. АСТАПЕНКІ І АЛЕСІНА была прынята наркамасьветы БССР т. ПЛАТУНОМ, па пытаньнях: стаўленьня ўдарнікоў у літаратуру і нападзеньня Усебеларускай выбудаўніцтва».

Тав. ПЛАТУН у гутарцы высунуў цікавую думку пра арганізацыю «сквозных» брыгад з настаўнікаў школ, якія прымацаваны да заводаў і прапетпісьменьнікаў, што працуюць у літтурткох з мэтай павышэньня агульна-адукацыйнай і агульна-тэарэтычнай пісьменнасьці рабочых ударнікаў, якія ідуць у літаратуру.

Тав. ПЛАТУН згадзіўся з прапановамі штабу выстаўкі «Пісьменьнік і сацыялістычнае будаўніцтва» пра плян арганізацыі яе. НКА на арганізацыю выстаўкі асыгнаваў 500 рублёў.

Апрача таго, т. ПЛАТУН прасіў дэлегацыю МенАПП'у ўзьняць пытаньне перад асацыяцыяй пра драматургічную творчую работу для беларускіх дзяржаўных тэатраў, мабілізаваць пісьменьнікаў на дапамогу ТРАМ'у.

***

НКА вызначае 7 парсанальных стыпэндый найбольш творча-актыўным членам МенАПП'у—студэнтам БДУ.

Рэдакцыя „Зьвязды" і ЦКК-РСІ СКЛІКАЮЦЬ
НАРАДУ па пытаньнях БУДАЎНІЦТВА Ў ЖЫВЁЛАГАДОЧЫХ САЎГАСАХ.
На нараду павінны зьявіцца прадстаўнікі: Лесбелу, Белсельбуду, Белмэталяб'яднаньня, Сьневаводу, Белсаўгастрэсту.
Нарада адбудзецца 30 жніўня ў 7 г. вечара, у габінэце рэдактара газэты „Зьвязда" (Савецкая, 63, 3 паверх).

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Мала здабыць торф, трэба яго ўбраць і вывезьці!

ВЫКАНАНЬНЕ СЭЗОННАГА ПЛЯНУ ТОРФАЗДАБЫЧЫ (У ПРОЦ.)

21 ЖНІЎНЯ	22 ЖНІЎНЯ
46,4	47,2

23 ЖНІЎНЯ	24 ЖНІЎНЯ
47,5	48,1

25 ЖНІЎНЯ
48,4

Па 22 заводах Белторфу на 26-га жніўня здабыта 336.804,0 тон торфу, што складае 46,4 проц. гадавой праграмы торфаздабычы.

Выканаў сваё сэзоннае заданьне і працаўнае торфаздабычу віцебскі завод «Чырвоны тарфяяк». Завод разгарнуў балую работу па сушцы і складаньні здабытага торфу ў штабэлі.

Наблізіліся да 100 проц. выкананьня сваёй гадавой праграмы торфазаводы «Закрашынскі мох», які здабыў 11.906,2 тоны торфу, што складае 91,5 проц. гадавога заданьня. «Ленінскі шлях» выканаў гадавое заданьне на 90,8 проц

Усё яшчэ адстаюць «Вольніца», «Рэмізава», «Чырвоная Беларусь», «Вялікі мох», «Калектыўная праца», Чырвоны сьцяг» і «Смалявічы».

Пагражаючае становішча з сушкай, уборкай і асабліва вывазкай здабытага торфу.

Да 27 жніўня вывазка торфу амаль ня была распачата.

Гэтага трывожнага факту ні Белторф, ні ВСНГ, ні торфазаводы на мясцох ня ўлічылі. Вывазка торфу большасьцю заводаў не распачата. Усё яшчэ застаецца і па сёньняшні дзень ня вырашаным пытаньне, хто павінен адказваць у асноўным за вывазку торфу—спажывец, ці Белторф.

Транспарт, які ёсьць у распараджэньні Белторфу, да вывазкі не падрыхтаваны. Ня прыняты меры да мэханізацыі як пагрузачных работ, так і вывазкі.

Асінторф у ліпені не дадаў БелДРЭС'у 18.008 тон торфу. Гэта лічба на жніўсень месяц павялічылася ў тры разы.

Такое становішча мы маем і на «Шляху сацыялізму», «Новай Беларусі», «Закрашынскім моху» і на радзе іншых буйнейшых заводах Белторфу.

Белторф заняўся падрыхтоўкай да сэзону 1932 г. Гэта блоспрочна прыходзіцца толькі вітаць. Але нікуды нявартым зьяўляецца той факт, што Белторф не прадпрыймае ніякіх захадаў да таго, каб зараз-жа ўбраць здабыты торф з палёў сьцілкі, бо калі плямы вывазкі ня будуць палкам выкананы, праграма торфаздабычы 1932 г. будзе пастаўлена пад пагрозу зрыву.

Час ідзе. Трэба зараз-жа максымум увагі зьвярнуць на ўборку і вывазку торфу.

Белторф, не адкладаючы ніводнага дня, павінен мабілізаваць сілы іменна на гэты вучастак работы, дабіцца дакладнага ўліку ходу гэтай работы па торфазаводах, бо адсутнасьць дакладнага ўліку ходу гэтай работы па торфазаводах, бо адсутнасьць дакладнага ўліку не дае поўнага малюнку таго, у якім зараз становішчы знаходзіцца сушка, уборка і вывазка торфу па БССР.

Белторф павінен, нарэшце, паклаасьці канец апартуністычным адгаворкам, што «мы не нясем адказнасьці за вывазку торфу, бо гэтай работай павінны займацца спажыўцы».

Неабходна, каб Белторф безадкладна забясьпечыў апэрацыйнае кіраўніцтва гэтай работай і дабіўся фарсаванага тэмпаў уборкі і вывазкі здабытага торфу.

Партыйныя арганізацыі, гаспадарчае кіраўніцтва торфазаводаў павінны зараз-жа разгарнуць гэту работу ўдарным тэмпам. Неабходна безадкладная мабілізацыя рабочай масы тарфяякаў на фронт уборкі і вывазкі, каб ні ў якім разе не пакінуць на палёх сьцілкі ніводнай здабытай тарфяной цагліны.

Зараз наступіў самы адказьнейшы этап работы тарфяной прамысловасьці. Партыйныя арганізацыі, прафсаюзы, камсамол, заводы-спажыўцы торфу—павінны аказаць канкрэтную дапамогу торфазаводам у барацьбе за поўнае выкананьне плянаў уборкі і вывазкі торфу.

ЦКК КП(б)Б і НК РСІ БССР аб становішчы на Асінторфе

ЦКК і НК РСІ БССР, правяраючы ход рэалізацыі пастановы ЦК і СНК аб торфараспрацоўках, адзначылі рад недапушчальных прарываў у рабоце Асінторфу.

Важнейшыя пункты пастановы ЦК і СНК БССР аб торфараспрацоўках на Асінторфе ўсё яшчэ ня выкананы. Поўнасьцю захаваецца абязьлічка, няма праграсыўнай зьдзельшчыны. Агрэгаты не пераведзены на гаспадарчы разрахунак.

Ня былі ўжыты меры па ліквідацыі ўраўнілаўкі ў зарплаце і барацьбе з цякучасьцю рабсілы.

Самы пагражаючы вучастак у рабоце Асінторфу — адгрузка здабытага торфу Белдрэсу.

Замест 400 ваганэтак у сутні, Асінторф адгружае толькі 200-160.

З 2-х дасланых торфазьбіральнікаў працуе толькі адзін, прычым са значнымі перабоямі. Адчуваецца вялікі недахоп ваганэтак: Замест патрэбных 180 ёсьць толькі 120, з якіх 30-40 знаходзяцца ў рамонце. Рамонт ваганэтак затрымліваецца.

У пагражаючым становішчы знаходзіцца падрыхтоўка да забесьпячэньня 100 проц. выкананьня прэмфінпляну торфаздабычы 1932 г.

Дагэтуль нават ня складзен праект гаспадаркі па эксплёатацыі балот, між тым тэрмін пачатку падрыхтоўчых работ ужо наступіў.

ЦКК і НК РСІ БССР прапанавалі заводакіраўніцтву і Белторфу прыняць тэрміновыя меры па абсталяваньні мэханічнай майстарні, выразна нападзіўшы рамонтныя работы і выпуск новых ваганэтак.

Заводакіраўніцтвам Асінторфу і Белторфу прапанавана безадкладна прыступіць да вызначэньня аб'ектаў будаўніцтва ў суровай адпаведнасьці з праграмай на 1932 г. з тым разьлікам, каб будаўніцтва было пачата не пазьней 1-га верасьня.

ЦКК і НК РСІ БССР лічыць неабходным аднесьці будаўніцтва на Асінторфе да ўдарных работ.

Белторф абавязан тэрмінова забясьпечыць мэханізацыю падрыхтоўчых работ на Асінторфе.

ЦКК і НК РСІ БССР ставіць пытаньне перад ЦК КП(б) і ЦК ЛКСМБ аб замацаваньні часткі мабілізаваных камуністаў і камсамольцаў для пастаяннай работы на торфазаводзе.

Спэцыялісты ВСНГБ высунулі сустрэчныя самаабавязацельствы

Сход спэцыялістаў ВСНГ БССР абвясьціў сябе мабілізаваным на выкананьне дырэктыўных паказаньняў тав. Сталіна і вызначыў на бліжэйшы перыяд наступныя канкрэтныя мерапрыемствы:

1. Прымацаваць 1 брыгаду спэцыялістаў да зав. «Камунар» для дапамогі ў арганізацыі ўнутрызаводзкага, унутрыцэхавага плянаваньня, уняцьненьня гаспадарчага разрахунку, лепшай падрыхтоўкі да 32 г. і кіраваньня гуртком па аўладаньні тэхнікай.

2. Зьвярнуцца да ўсіх аб'яднаньняў аб прымацаваньні брыгад спэцыялістаў да прадпрыемстваў.

3. Вызначыць 1 брыгаду для дапамогі падпэфнаму калгасу ў пераводзе яго на зьдзельшчыну і пастаноўку вучоту ў ім.

4. Улічваючы, што пасьпяховая работа спэцыялістаў на карысьць сац. будаўніцтва немагчыма без належнага падвышэньня палітычных ведаў, — арганізаваць гурток паліт. ведаў для спэцыялістаў ВСНГ БССР і некаторых аб'яднаньняў.

5. Для прыбываючых т. т. з зав. «Камунар» у парадку сацсумяшчальнасьці арганізаваць рад лекцый і аказаць канкрэтную дапамогу ў іх рабоце.

Сход адабрыў пастанову прэзыдыуму ВСНГ БССР аб выдаленьні тэхнікаў часопісі і заклікаў спэцыялістаў ВСНГ, аб'яднаньняў і прадпрыемстваў прыняць актыўны ўдзел у выданьні гэтакага.

Выказана пажаданьне каб у часопісі утварыць аддзел кансультацыі для інжынэраў і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу.

Сход прызнаў неабходным прымацаваць 5 спэцыялістаў, да прадпрыемстваў на сталую пасаду на сумяшчальнасьці для дапамогі адміністрацыйна-тэхнічнаму пэрсаналу.

Арганізаваць заняткі для пова-скончыўшых спэцыялістаў ВСНГ і аб'яднаньняў па практычных матар'ялах.

Прыняць актыўны ўдзел у мабілізацыі спэцыялістаў на падрыхтоўку да складаньня пляну другой пяцігодкі.

Завод імя Ланцуцкага—шэф над фінапаратам

ГОМЕЛЬ.

Завод імя Ланцуцкага шэфствуе над гарадзкім фінадзелам. Аднак, гэтае шэфства фактычна існуе толькі на паперы. Да гэтага часу шэфы нічога не зрабілі для ліквідацыі прарываў у выкананьні фінпляну. У трэцім квартале плян уцягненьня ўкладаў у ашчадкасы перадыкапан па 200 тыс. руб., на зямельнай рэнце—на 100 тыс. руб. Гэтыя прарывы патрабуюць увагі і актыўнай дапамогі фінорганам з боку рабочай грамадзкасьці.

Толькі за апошні час шэфы некалькі раз варушыліся. Партыйны камітэт заводу імя Ланцуцкага пастанавіў у бліжэйшы час склікаць агульную канфэрэнцыю рабочых заводу разам з работнікамі фінапарату на пытаньні аб ліквідацыі прарыву. На заводзе разгорнута кампанія за ўцягненьне новых укладчыкаў у ашчадкасы. Шмат рабочых ужо ўступілі ўкладчыкамі і абавязаліся па працягу году ўносіць штомесячна ў ашчадкасу 17 руб.

На заводзе працуе спэцыяльная брыгада «Палескай праўды».

Б. ЗЭЛЬМАНАЎ.

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа прыватніку"

Калгасьнікі Жлобінскага раёну АРГАНІЗУЮЦЬ МАСАВЫЯ ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ

Здалі 3.750 цэнтн. збожжа

ЖЛОБІН (наш кар.)

23-га жніўня калгасьнікі і адназасобнікі Жлобінскага раёну арганізавалі вялікі чырвоны абоз са збожжам у ліку 1.600 фурманак. Абозам здана дзяржаве 3.750 ЦЭНТ. ЗБОЖЖА.

А 12 гадзіне дня адбыўся кароткі мітынг прысьвечаны прыбыцьцю абоза. Раённыя арганізацыі перадалі пераходныя чырвоныя сьцягі: МАЛЯВІЦКАМУ СЕЛЬСАВЕТУ за пасьпяховае правядзеньне калектывізацыі (на сёньняшні дзень па сельсавеце калектывізавана 77,9 проц. бяднацка-сярэдняцкіх гаспадарак), КАЛГАСУ «11-ці ГОДЗЬДЗЕ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ» (Кароткаўскі с-с.)—за пасьпяховае скончэньне ўборкі ўраджаю і добрую арганізацыю працы.

СТРЭШАНСКАМУ СЕЛЬСАВЕТУ—за ганебную бязьдзейнасьць і зрыў усіх гаспадарча-палітычных кампаній перададны «ордэн чарапахі». Тут-жа на мітынгу за прыкладны ўдзел у варашылаўскім суботніку па ўборцы ўраджаю Жлобінскаму гарнізону выдана ганаровая грамота.

Загатоўчыя арганізацыі не падрыхтаваліся належным чынам да сустрэчы новага ўраджаю. Пры прыёме збожжа ад чырвонага абозу былі вялікія затрыманьні: ня было вагі, не хапала работнікаў і г. д. Прышлося закрыць на гэты дзень некаторыя крамы спажыўсаюзу і перакінуць адтуль работнікаў.

Загатоўчыя органы абавязаны не адкладна на-ходу выпраўіць не дахопы з тым, каб наступны чырвоны абоз ня сустрэў ніякіх торгмазаў у здачы збожжа дзяржаве.

МАШНІЦКІ.

ТАЛАЧЫН.

Калгасы «Камсамольская Праўда», «8-га сакавіка», «Сталінскі заклік», «Сьцяг працы», «Ленінскі шлях», «6-ы зьезд саветаў» і «Чырвоны франтавік» (Волкавіцкага сельсавету) і калгас «Чырвоныя Петрашы» (Рыдамскага сельсавету) 12 жніўня арганізавалі чырвоны абоз са збожжам. Усяго здана 108 цэнт. збожжа. На мітынгу арганізаваным у гонар абозу, калгасьнікі запэўнілі раённыя кіруючыя арганізацыі, што яны поўнасьцю і датэрмінова выканаюць заданьне па збожжа-загатоўках і не пакінуць ніводнага кілё збожжа на прыватны рынак.

Ткачоў.

„Памылкі статыстыкі"

ЧАЧЭРСК.

Ход уборачнай і збожжазагатоўчай кампаніі па Чачэрскім раёне выразна паказвае, што раённыя арганізацыі не падрыхтаваліся своечасова да гэтай важнейшай работы. І ўборка, і загатоўка ідуць чаргаными тэмпамі.

РВК з недапушчальным спазьненьнем накіраваў сваіх упаўнаважаных у сельсаветы для правядзеньня ўборкі і збожжазагатовак.

У плянаваньні збожжазагатовак існуе поўная блытаніна. РВК дасылае сельсаветам зацьверджаныя пляны, потым па некалькі раз іх мяняюць.

Так, быў даведзены да сельсаветаў плян загатовак сена, бульбы, жыта. Сельсаветы ў сваю чаргу давялі пляны да двара і прыступілі да выкананьня. Але потым РВК прыслаў новыя лічбы і прышлося перарабіць усё з пачатку. РВК матываваў гэту зьмену «памылкай статыстыкі».

Гэтыя «памылкі статыстыкі» вельмі тармозяць загатоўкі і ствараюць недапушчальную цяганіну.

Кантрактацыйныя кніжкі і сьпісы ў сельсаветы да гэтага часу яшчэ не дасланы. Наогул з кантрактацыяй справа стаіць дрэнна. Кантрактацыйныя дагавары дагэтуль яшчэ не афармлены.

ПРАЦЬКО.

Чаргі на прыёмачным пункце

ЦЕРАХАЎКА, 19. (БЕЛТА). ГЭТЫМІ ДНЯМІ Ў ЦЕРАХАЎКУ ПРЫБЫЛА 300 ФУРМАНАК З СЕНАМ З КАЛГАСАЎ І САЎГАСАЎ. ЗАГАТОЎЧЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЕ ПАДРЫХТАВАЛІСЯ ДА СУСТРЭЧЫ ЧЫРВОНЫХ АБОЗАЎ. НЕ ХАПАЛА ГІР. ЗДАТЧЫКАЎ АБСЛУГОЎВАЛА ТОЛЬКІ АДНА ВАГА. КАЛГАСЬНІКІ . ФУРМАНШЧЫКІ ПА ПАЎДНЯ СТАЯЛІ Ў ЧАРЗЕ, ЧАКАЮЧЫ, ПАКУЛЬ ПРЫМУЦЬ АД ІХ СЕНА. ДРЭННАЯ ПАДРЫХТОЎКА ДА ПРЫЁМКІ СЕНА САМЫМ АДМОЎНЫМ ЧЫНАМ АДБЫВАЕЦЦА НА ЗАГАТОЎКАХ І СПРЫЯЕ КУЛАЦКАМУ САБАТАЖУ. ЗА ТАКІЯ АДНОСІНЫ ДА ЗАГАТОВАК ТРЭБА ВІНАВАТЫХ АДДАЦЬ ПАД СУД.

Нездаровая канкурэнцыя—замест дружнай работы

САЛТАНАЎКА. (Наш кар.). Загатоўкі гародніны ў Салтанаўцы праводзяць чатыры арганізацыі: малочнае таварыства, Жлобінскі райсаюз, Рагачоўскі і Буда-Кашалёўскі райкаапсаюзы. Замест дружнай работы загатоўшчыкі канкуруюць паміж сабою і ніяк ня могуць дагаварыцца нахонт адпраўкі гародніны.

Загатоўшчыкі гародніны скажаюць абзуш гаспадарчага разрахунку, іншчыся адбіць адзін у другога загатоўлены тавар. «Гандлярскі душок» панае ва ўсёй рабоце.

Нездаровая канкурэнцыя прыводзіць да пагоршаньня якасьці загатоўленай гародніны, да нерацыянальнага скарыстаньня чыгуначнага транспарту.

А. В.



Чырвоны абоз калгасу імя Крупскай.

Ударная работа

ГОМЕЛЬ. (НАШ КАР.). ДЗЯКУЮЧЫ ПРАВЕДЗЕНАЙ ВАЛЬШАВІЦКАЙ РАБОЦЕ, ПРЫВАРСКІ СЕЛЬСАВЕТ, ГОМЕЛЬСКАГА ПРЫГАРАДНАГА РАЁНУ, ДАВІЎСЯ ПЕРАМОГІ НА ФРОНТЕ ЗАГАТОВАК. ЯН ЗДАЎ 15 ТОН СЕНА — 100 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ, 55 ТОН САЛОМЫ — 140 ПРОЦ. ПЛЯНУ І 11 ТОН ЗБОЖЖА — 100 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ. СЕЛЬСАВЕТ ВЫСУНУЎ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН ЗАГАТОВАК — ЗДАЦЬ ЯШЧЭ 27 ТОН СЕНА, 7 ТОН САЛОМЫ І 4 З ПАЛ. ТОНЫ ЗБОЖЖА. ПРЫВАРСКІ СЕЛЬСАВЕТ УЗЯЎ НА БУКСІР ПА ПЫТАНЬНІ ЗАГАТОВАК І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ЎРЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ.

Паход за санмінімум

Санкамісіі пры жактах НЕ ПРАЦУЮЦЬ

ПАХОД ЗА САНМІНІМУМ ЗРАБІЦЬ НЕПАСРЭДНАЙ СПРАВАЙ САМІХ МАС



Савецкая вуліца Менску пасьля брукаваньня.

Белжылсаюз у ролі глядача

Паход «за санмінімум», які зараз праводзіцца, зусім не закрануў Белжылсаюзу. Ён ня прымае ніякіх мер да таго, каб палепшыць санітарнае становішча жактаў.

Санкамісіі пры жактах не працуюць, ніякіх мер да ажыўленьня іх работы ня прынята. Масавая работа вакол санмінімуму спрод жыхароў жактаў таксама не вядзецца.

Дырэктыва СНК аб стварэньні пры жактах ачышчальных абозаў ня выконваецца. Ведаючы аб антысанітарыі, якая панае ў жактаўскіх дамох, Белжылсаюз ня прыняў на сваёй лініі ніякіх мер і чакае ўмяшаньня пракуратуры.

На запытаньне — колькі старшынь жактаў прыцягнуты да адказнасьці і аддана пад суд за антысаніярыю — член праўленьня Белжылсаюзу Дзьмітрыеў адказаў: «гэта нам невядома, зьвярнецеся ў пракуратуру».

Трэба ліквідаваць апартуністычную бязьдзейнасьць праўленьня Белжылсаюзу ў справе санітарнага ўздараўленьня гораду.

Адміністрацыя Асінторфу ігнаруе санмінімум

Брыгада НК Аховы Здароўя, якая выяжджала на Асінаўскія торфараспрацоўкі, сустрэлася з абураючымі фактамі антысанітарыі, злачынна-нядбайнымі адносінамі да бытавога абслугоўваньня рабочых.

У бараках, дзе жывуць рабочыя, поўна пылу і бруду. На ложках няма ніякіх пасьцельных прылад. Чыстай вады няма, рабочыя вымушаны піць ваду з тарфяных ям.

У выніку — вялікая цякучасьць рабочай сілы.

Рабочыя скардзяцца на дрэнную пастаноўку грамадзкага харчаваньня. Абеды гатуюцца з нядобраякасных прадуктаў і заўсёды аднастайныя. На Асінторфе зусім няма гародніны.

Адміністрацыя ні ім не рэагуе на такое становішча. Мы патрабуем прыцягненьня вінаватых да адказнасьці і неадкладнага паляпшэньня бытавых умоў рабочых Асінторфу.

Брыгада

Дзе трыкутнік фабрыкі „Усход"?

Санітарнае становішча галянтарэйнай фабрыкі «Усход» зусім нездавальняючае. У цэхах няма бакаў для гатаванай вады. Няма медпункту ў той час, як на фабрыцы працуе 800 рабочых.

Рабочыя абедаюць у цэхах; абеды ў большасьці дрэнная якасьці.

Трыкутнік фабрыкі нічога ня робіць для ажыцьцяўленьня санмінімуму. Трэба карэнным чынам палепшыць санітарнае становішча фабрыкі «Усход».

БРУДНЭР.

Уводная частка

Пасьпяховасьць работы сьвінагадоўчай таварнай калгаснай фермы цалкам залежыць ад таго, як калгасы і калгасьнікі будуць весьці работу па паляпшэньні пралукцыйнасьці стада, праводзіць зоаветэрынарныя мерапрыемствы, будаўніцтва сьвінарнікаў і забясьпечваць фэрму кармамі, вылучаць лепшых, найбольш вопытных калгасьнікаў і калгасьніц для работы на фэрме і арганізаваць іх на сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва ў рабоце на фэрме, на барацьбу з кулацтвам і яго агентурай, за ўмацаваньне працоўнай дысцыпліны і гаспадарчую бярэжлівасьць.

1. Для загадваньня СТКФ праўленьне калгасу вызначае загадчыка.

Загадчык фэрмы зацьвярджаецца рэспубліканскім або краёвым (абласным) аддзяленьнем (упаўнаважаным) Сьвінаводкалгасцэнтру СССР.

2. Загадчык фэрмы назначаецца тэрмінам ня менш, як на 2 гады. Зьмена загадчыка да канца двухгадовага тэрміну можа быць толькі па агульнай згодзе калгасу і упаўнаважанага Сьвінаводкалгасцэнтру СССР.

Калі-ж сьвінагадоўчая таварная калгасная фэрма зьяўляецца міжкалгаснай, дык загадчык гэтай фэрмы назначаецца і зьмяняецца ўпаўнаважаным Сьвінаводкалгасцэнтру СССР.

3. Загадчык фэрмы адназасобна кіруе ўсёй справай фэрмы і адназасобна нясе адказнасьць за арганізацыю і вядзеньне гаспадаркі фэрмы.

4. Загадчыку СТКФ падначальваюцца ўсе працаўчыя на фэрме як калгасьнікі і калгасьніцы, вылучаныя калгасамі для работы на фэрме, так і наймовыя спэцыялісты.

ПАЛАЖЭНЬНЕ АБ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ І ЎНУТРАНЫМ РАСПАРАДКУ НА СЬВІНАГАДОЎЧЫХ ТАВАРНЫХ КАЛГАСНЫХ ФЭРМАХ*)

Арганізацыя брыгад і замацаваньне калгасьнікаў на рабоце СТКФ

Для пастаяннага абслугоўваньня сьвінафэрмы калгас вылучае патрэбную колькасьць калгасьнікаў з ліку ўдарнікаў, а таксама тых, што маюць вопыт і жадаюць працаваць на сьвінагадоўлі.

1. Усе вылучаныя калгасьнікі для работы ў СТКФ замацоўваюцца на фэрмах на пастаянную работу. У перыяд вялікай напружанасьці работы на фэрмах (час апаросу і інш.) рэкамэндуецца прымацоўваць дадатковую колькасьць калгасьнікаў на выкананьне работы данага сэзону.

2. У залежнасьці ад разьмеру фэрмы арганізацыя працы можа быць рэкамэндавана наступная:

а) На фэрмах, дзе стада не перавышае 100 сьвіноматак, брыгады не ствараюцца і непасрэднае кіраўніцтва работай сьвінароў усклаадзецца на загадчыка фэрмай. За кожным-жа калгасьнікам, які працуе на фэрме, прымацоўваецца пэўная група (колькасьць) сьвіней, якіх ён даглядае і нясе адказнасьць перад загадчыкам фэрмы.

б) На фэрмах, дзе сьвіное стада разьмешчана ў некалькіх сьвінарніках і дзе ёсьць звыш 100 дарослых сьвіноматак, якія паросяцца, работа арганізуецца пабрыгадна; пажадана ў кожным сьвінарніку брыгада. Гэта брыгада выконвае ўсё кола работ, зьвязаных з абслугоўваньнем данай колькасьці сьвіней у сьвінарніку. На чале брыгады стаіць старэйшы сьвінар (брыгадзір), які нясе асабістую адказнасьць перад загадчыкам фэрмы за ўсе работы па даглядзе, кармленьні і захаваньні маладняка. Уплеваны і захаваньні маладняка. Уплены брыгады да кожнага калгасьніка прымацоўваецца пэўная група (колькасьць) сьвіней.

в) На сьвінафэрмах з нагалоўем сьвіней каля 1.500 і больш для лепшай арганізацыі працы мэтазгодна рабіць расстаноўку паасобных груп жывёлы (супаросныя і падсосныя маткі, маладняк, які вырошчваецца, і адкормачнае стада) па асобных сьвінарніках. Для абслугоўваньня кожнай з гэтых груп жывёлы арганізуюцца паасобныя брыгады з абавязковым прымацаваньнем унутры кожнай брыгады да кожнага сьвінара пэўных жывёлін, якіх ён заўсёды і абслугоўвае.

На чале з кожнай з гэтых брыгад (па вырошчваньні маладняка, па даглядзе супаросных і падсосных матак і па адкормачнай групе) стаіць старэйшы сьвінар (брыгадзір), які вызначаецца загадчыкам фэрмы.

Старэйшы сьвінар (брыгадзір) нясе адказнасьць за стан усёй групы даручаных яму сьвіней і за работу ўсяго складу брыгады.

3. Ва ўсіх пералічаных выпадках за кожным сьвінаром абавязкова замацоўваецца пэўная група (колькасьць) сьвіней, якіх ён заўсёды даглядае і за стан якіх ён адказвае.

Унутраны распарадак на СТКФ

1. Усе работы на сьвінафэрме вядуцца паводле правілаў унутранога распарадку фэрмы. Гэтыя правілы распрацоўваюцца загадчыкам фэрмы і зацьвярджаюцца праўленьнем калгасу.

2. Кожны працаўчы на сьвінафэрме абавязан дакладна выконваць устаноўлены для яго распарадак дня.

Прыкладны распарадак дня можа быць наступны:

Работа на фэрме пачынаецца не пазьней 5 гадзін раніцы і разьмяркоўваецца, прыкладна, так:

А. У ЧАСЕ СТОЙЛАВАГА ПЭРЫЯДУ

1) ПРЫ ДОГЛЯДЗЕ ДАРОСЛЫХ СЬВІНЕЙ

РАНІЦА:

(Работы канчаюцца не пазьней 9 гадзін раніцы):

а) падрыхтоўка корму і кармленьне,

б) паеньне чыстай вадой пасьля кармленьня,

в) чыстка кармушак, стойлаў і падсьцілка саломы.

ДЗЕНЬ:

(Работы пачынаюцца з 12 гадзін і канчаюцца не пазьней 4 гадзін дня):

а) падрыхтоўка корму і дача яго,

б) паеньне вадою,

в) чыстка кармушак,

г) выпуск сьвіней на прагулку і загон сьвіней у сьвінарнік.

ВЕЧАР

(Работы пачынаюцца з 6 гадзін і канчаюцца не пазьней 8 гадзін вечара):

а) падрыхтоўка корму і кармленьне,

б) паеньне,

в) чыстка кармушак і стойлаў.

2) ПРЫ ДОГЛЯДЗЕ ПАРАСЯТ-АД'ЕМЫШАЎ

РАНІЦА

(Работы канчаюцца не пазьней 9 гадз. раніцы):

а) падрыхтоўка корму для падкормкі парасят і скармліваньне яго,

б) чыстка кармушак, уборка гною ў сьвінарніках, пастаноўка ў падкормачным аддзяленьні скрынь з пяском, драўнінным вугалем і падсьцілка саломы.

в) выпас кармушак для прасушкі.

ДЗЕНЬ

(Работа пачынаецца з 10 гадзін раніцы і канчаецца не пазьней 5 гадзін вечара):

а) падрыхтоўка корму і кармленьне парасят,

б) чыстка кармушак,

в) выпуск парасят на прагулку,

г) падрыхтоўка корму і кармленьне парасят,

д) чыстка кармушак,

е) падрыхтоўка корму і кармленьне парасят,

ж) чыстка кармушак.

ВЕЧАР

(Работы пачынаюцца з 10 гадзін раніцы і канчаюцца не пазьней 5 гадзін вечара):

Пры адкорме падсьвінкаў распарадак дня ўстанаўляецца такі-ж, як і па доглядзе дарослых сьвіней.

Б. У ПЭРЫЯД ПАШЫ

1. Сьвіньні ўсіх узростаў і груп павінны шырока карыстацца натуральнымі і штучнымі выпасамі.

2. З прычыны таго, што пераросшыя і агрубелыя травы сьвіньні ня выкарыстоўваюць, фэрма павінна ўвесьці ў пасевах выпасных культур такі парадак, каб сьвіньні на працягу ўсяго выпаснага перыяду былі забясьпечаны сакавітай пашай. Для гэтага рэкамэндуецца ў парадку чарговасьці выкарыстаньне наступных выпасаў.

Найбольш ранныя выпасы даюць (раньняй вясною):

а) азімае жыта чыстае, лепш в вікаю,

б) азімы рапс.

За імі ідуць:

в) яравы рапс, г) авёс з вікаю, д) шчат гадовых травы: канюшына, люцэрна, доньнік і інш.

Далей:

е) сол. ж) суданка, з) сорга цукровая, і) атава рапсу, к) другі пасеў вікі з аўсом, л) атава шматгадовікоў.

Нарэшце:

м) палі пасьля ўборкі збожжа, н) палі пасьля ўборкі корань і клубнеплодаў, адначасова з асеньнімі травамі і пасеўных траў і асеньняя маладая паросьль сарнякоў.

3. На выпасах, падрыхтаваных фэрмай шляхам пасеву траў, а таксама зручных для выпасу звычайных (непасеўных) выгонаў, багатых травою, наладжваюцца пераносныя платы і лёгкія навесі для абароны ад дрэннага надвор'я і гарачыні, тады сьвіньні не адчуваюць патрэбы ў асобных пастухох і карыстаюцца выпасам у любы час сутак па ўласным жаданьні.

4. Пры ўтрыманьні сьвіней у пераносных загарожах на пашах парадак работ робіцца надвычай простым і зводзіцца да наступных работ:

ПА ЎСІХ ГРУПАХ СЬВІНЕЙ

РАНІЦА

(Работа праводзіцца да 5 гадзін раніцы):

а) выдача канцэнтраванага корму,

б) паданой.

АБЕД

(Работа праводзіцца да 12 гадзін дня)

а) дача канцэнтраванага корму, б) паданой і купаньне (там, дзе гэта магчыма).

ВЕЧАР

(Работа праводзіцца вечарам і канчаецца не пазьней 8 гадзін вечара):

а) дача канцэнтраванага корму, б) паданой.

5. При ўтрыманьні сьвіней на адкрытых выпасах распарадак работ наступны:

ПА ГРУПЕ ПАДСОСНЫХ МАТАК

РАНІЦА

(Работа пачынаецца з 5 гадзін раніцы і канчаецца не пазьней 11 гадзін раніцы):

а) дача канцэнтраванага корму і паданой, б) паша, в) купаньне (там, дзе гэта магчыма) і паданой, д) дача канцэнтраванага корму.

АБЕД

(Работа праводзіцца да 2 гадзін дня):

а) купаньне (там, дзе гэта магчыма) і паданой, б) дача канцэнтраванага корму, в) паша.

ВЕЧАР

(Да 7 гадзін вечара):

а) дача канцэнтраванага корму і паданой, б) па групе ад'емышаў і адкормачных парадак работ такі-ж, як і па групе падсосных матак.

ПА ГРУПЕ ХРАКОЎ І ХАЛАСТЫХ МАТАК

РАНІЦА

(Пачынаецца з 5 гадзін раніцы і канчаецца не пазьней 11 гадзін раніцы):

а) паша, б) купаньне і паданой, в) дача канцэнтраванага корму.

АБЕД

(Пачынаецца з 11 гадзін раніцы і да 7 гадзін вечара):

а) адпачынак і купаньне (дзе магчыма), б) паша, в) дача канцэнтраванага корму і паданой.

6. При ўтрыманьні сьвіней на пашы як у загарожах, так і ў адкрытых загонах, яны разьмяркоўваюцца на пагульныя асобныя групы:

група падсосных матак

група супаросных матак,

група халастых матак,

група ад'емышаў,

група адкармліваньня маладняка,

група хракоў.

При пазначэньні ніякіх колькасьці хракоў яны трымаюцца на прывязі. Прывязваць трэба так, каб храк не задушыўся і не заблытаўся. Для гэтага прывязь трэба зрабіць з дзьвёх дзесьмяных падпруг, замацаваных паміж сабою двума панскамі. Гэтыя падпругі прывязваюцца храку так, каб адна падпруга была на шыі, а другая — за пярэднімі нагамі.

Да канцоў падпругі прымацоўваюцца скураныя раменьні. Падпругі засьцёгваюцца пражкамі, прышытымі да раменных канцоў. На канцы пярэдняй пэйнай падпругі ўмацоўваецца вяроўка. Другім канцом вяроўка прывязваецца да кала, убітага ў зямлю.

Прапанаваны прыкладны распарадак дня можа зьмяняцца ў залежнасьці ад мясцовых умоў; але падрыхтоўка корму, кармленьне, паеньне жывёлы, чыстка памяшканьняў і г. д. павінны рабіцца кожны дзень у аднолькавыя гадзіны, бо паеньне, кармленьне жывёлы і інш. у розны час адбіваецца на жывёле і ніякае не прадукцыянасьць.

7. Кожны працаўчы калгасьнік на фэрме павінен ведаць свае абавязкі і правілы догляду жывёлы.

(Працяг будзе)

*) Гэта палажэньне зьяўляецца прыкладным і можа зьмяняцца і дапаўняцца паводле пастановы праўленьня калгасаў, пры якіх арганізаваны сьвінагадоўчыя фэрмы. Пры адсутнасьці гэтых зьмен і дадаткаў гэта палажэньне зьяўляецца для фэрм абавязковым.

Год выдання—XV
№ 145 (4146)
Нядзеля 30 жніўня 1931
Цана [illegible] 5 коп.
БЕСПЛАТНА

Зьвязда

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, Сурганава, 63.
Тэлефоны
рэдактар—1-27, сакратар—10-14, партсакратар—13-80, прамысл.—13-80, сял. аддз.—5-19, мясц. інфарм.—5-19, замеж. інфарм.—8-10, адказны рэдактар—6-42, міжнародны інфармацыі—10-74, [illegible]—7-74

На абарону палоньнікаў польскага фашызму!

ГНЕУ МІЛЬЕНАЎ

Агульны сход курсантаў, чырвонаармейцаў, начскладу, вольна занятых рабочых і служачых, а таксама збору начскладу запасу — рашуча пратэстуе супроць нябывалага ашчэ ў гісторыі ўціску, зьверстваў і катаваньняў, якія зараз учыняе адчаяны польскі фашызм над рабочымі і сялянамі Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны.

Фашысцкія каты на вышэрадкі выноходзяць «цывілізаваныя» спосабы фізычнага зьнішчэньня, сваіх безабаронных палонных — лепшых барацьбітоў за пралетарскую рэвалюцыю, за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне ад беларускіх акупантаў. Зьбіваньне жалезнымі прутамі, мілетамі, гвалтаваньне жанчын, напоўненьне вадой карцэры, уліваньне праз нос мачы, заражэньне сыфілісам — вось агідны сьпіс самых новых вынаходзтваў дэфэнзыўнай тэхнікі.

Але польскі фашызм, як і яго гаспадары, — прапічацца. Ім ня ўдасца задушыць бурнага росту рэвалюцыйнага руху, які адбываецца на ўсіх куткох панскай Польшчы пад сталёвым кіраўніцтвам камуністычнай партыі. Польскаму фашызму ня ўдасца таксама зламаць рэвалюцыйную стойкасьць сваіх палоньнікаў.

Сход шле сваё гарачае брацкае прывітаньне братом па клясе — рабочым, рэвалюцыйным сялянам Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны і палітзьняволеным у фашысцкіх карцэрах. Вайцы і камандзіры Чырвонай арміі заклікаюць вас, таварышы, ашчэ вышэй узьняць сьцяг рэвалюцыйнай барацьбы з фашысцкай дыктатурай за пралетарскую рэвалюцыю. Сход запэўніе ленінскую партыю, рабочую клясу і ўсё працоўнае сялянства, што чырвоаармейцы, курсанты, камандзіры ашчэ больш узмацнуць праяўляць у справе ўзмацненьня баяздольнасьці СССР.

Прэч белы тэрор!

***

Настаўніцтва Віцебскага раёну і гор. Віцебску ў адказ на крывавыя зьдзекі туремных катаў Польшчы над палітзьняволенымі абавязваецца напружыць усе свае сілы ў разгортваньні кампаніі зімовай дапамогі палонным капіталу і іх сем'ям. Настаўніцтва абавязваецца з першага-ж дня навучальнага году разгарнуць інтэрнацыянальна-выхаваўчую работу сярод вучнёўства, зьвязаўшыся з зарубежнымі дзецьмі барацьбітоў рэвалюцыі. У фонд дапамогі палітзьняволеным агульны сход адлічае 1 проц. месячнага заработку.

***

МАЗЫР, 27. (БЕЛТА). Агульны мітынг рабочых фабрыкі «Прафінтэрн» пратэстуе супроць нячуваных зьдзекаў польскага фашызму над тысячамі палітзьняволеных. У адказ рабочыя абяцаюць з ашчэ большай энэргіяй змагацца за прамфінплян трэцяга рашаючага, узмацніць абароназдольнасьць краіны і ашчэ цясьней з'арганізавацца вакол кампартыі і яе ленінскага ЦК.

Сход рабочых пастанавіў адпрацаваць звыштэрмінова 4 гадзіны ў карысьць палітзьняволеных.

***

Мы, камандзіры запасу, якія да сёньняшняга дня былі аднаасобнікамі, сабраўшыся на перападрыхтоўку пры АБВШ, у адказ на падрыхтоўку імпэрыялістычных дзяржаў да вайны супроць СССР, у адказ на масавыя забойствы палітзьняволеных, на фашысцкі тэрор польскай буржуазіі ў адносінах да рэвалюцыйнага руху — уступаем у калгасы і заклікаем увесь начскład запасу РСЧА пасьледаваць нашаму прыкладу — перавесьці з аднаасобнай гаспадаркай, якая параджае капіталізм, у ступіць на шлях калгаснага будаўніцтва — на шлях сацыялізму.

Няхай жыве кампартыя!

Няхай жыве сусьветная пралетарская рэвалюцыя!

***

Мопраўская ячэйка КАМУНЫ ІМЯ ЛЕНІНА (Чачэрскі раён) праводзіць інтэнсыўную работу ў сувязі з кампаніяй пратэсту супроць разгону белага тэрору ў турмах фашысцкай Польшчы. 180 МОПРАЎЦАЎ І 600 КАМУНАРАЎ РАШУЧА ПРАТЭСТУЮЦЬ СУПРОЦЬ КРЫВАВАЙ РАСПРАВЫ НАД НАШЫМІ БРАТАМІ ПА КЛЯСЕ. ЯЧЭЙКА САБРАЛА Ў ФОНД ДАПАМОГІ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫМ 248 РУБ. І ВЫБРАЛА Ў СУБОТНІК «МОПРАЎСКУЮ ПАЛОСКУ» ВУЛЬБЫ НА 208 Р. У часе мітынгу пратэсту ў МОПР уступіла 25 КАМУНАРАЎ. Мопраўская ячэйка камуны імя Леніна выклікае на сацспаборніцтва па правядзеньні кампаніі дапамогі палітзьняволеным і інтэрнацыянальнай работы ўсе мопраўскія ячэйкі Чачэрскага раёну.

Азьвярэлае абшарніцтва распраўляецца з галадаючымі беспрацоўнымі

ВАРШАВА. Матар'яльнае становішча соцень тысяч беспрацоўных у фашысцкай Польшчы ПАГАРШАЕЦЦА З КОЖНЫМ ДНЁМ. Штодня адбываюцца шматлікія выступленьні беспрацоўных, якія ў большасьці ПЕРАТВАРАЮЦЦА Ў КРЫВАВЫЯ СУТЫЧКІ З ПАЛІЦЫЯЙ. Беспрацоўныя ў гарадох, ДАВЕДЗЕНЫЯ ДА РОСПАЧЫ ПАСТАЯННЫМ ГОЛАДАМ, РАЗБУРАЮЦЬ ХАРЧОВЫЯ КРАМЫ, ГРАМЯЦЬ МАГІСТРАТЫ І ВАЯВОДЗТВЫ, ЯКІЯ ПАЗБАЎЛЯЮЦЬ ІХ ГРАШОВЫХ ДАПАМОГ. Так, у ВІТКАВІЦАХ у Верхняй Сілезіі дайшло да БУРНЫХ ХВАЛЯВАНЬНЯЎ БЕСПРАЦОЎНЫХ, ЯКІХ ФАШЫСЦКІЯ ЎЛАДЫ ПАЗБАВІЛІ ХАРЧОВЫХ ДАПАМОГ. Мясцовую паліцыю, якая была выклікана на месца хвалявань, беспрацоўныя ЛІТАРАЛЬНА ЗАКІДАЛІ КАМЕНЬНЯМІ. Ня здолеўшы справіцца з дэманстрантамі, паліцыя зьвярнулася за дапамогай у КАТАВІЦЫ. У хуткім часе адтуль прыбыло на двух грузавіках значнае паліцэйскае падмацаваньне. ПАЧАЛАСЯ ЗЬВЯРСКАЯ РАСПРАВА, У ВЫНІКУ ЯКОЙ НЕКАЛЬКІ БЕСПРАЦОЎНЫХ ПАРАНЕНА. ПАЛІЦЫЯ ПРАВЯЛА ШМАТЛІКІЯ АРЫШТЫ.

У вёсцы, дзе беспрацоўных налічваюцца сотні тысяч, ПАНУЕ СТРАШЭННАЯ ГАЛЕЧА. Сотні гэтых няшчасных, каб не памерці з голаду, ідуць на помешчыцкія палі з мэтай здабыць бульбы альбо якой-небудзь гародніны. Але звычайна сустракае іх крывавая абшарніцкая расправа. Фашысцкі друк стракаціць паведамленьнямі АБ ЗАБОЙСТВАХ ГАЛАДАЮЧЫХ БЕСПРАЦОЎНЫХ АЗЬВЯРЭЛЫМІ ПАМЕШЧЫКАМІ.

Так, фашысцкая газэта «ПАЛЕНІЯ» падае: «7 жніўня каля Пазнані, у часе палявой пакражы БЫЎ ЗАБІТЫ РАБОЧЫ ГЖЭЗІХА».

Са сваім маленькім сынам накіраваўся ён у поле кулака і пачаў сярпом жаць канюшыну. Бяз усякага папярэджаньня атрымаў кулю.

Аб такім-жа выпадку паведамляе фашысцкі «КУР'ЕР ЗАХОДНІ»: «На палёх маёнтку «СЕМЯНОВІЧЫ» каля ЧЭЛЯДЗІ позна ўвечары вартаўнік, які пільнаваў палі, заўважыў сярод зеляніны чалавека. Стрэліў. На месцы застаўся труп. Быў гэта нейкі беспрацоўны з Семяновіч, які прышоў накапаць сабе бульбы».

У лесе пад Жырардавым дайшло да вострай страляніны паміж лясьнікамі і групай беспрацоўных у 20 чалавек, — якія накіраваліся ў лес, каб назьбіраць дрэва на апал. 7 БЕСПРАЦОЎНЫХ ЦЯЖКА ПАРАНЕНА

„З нашых радоў ня выходзілі начальнікі паліцыі"

Адкрыты ліст нямецкіх рабочых да зьезду рэфармісцкіх прафсаюзаў

БЭРЛІН, 28. 30 тысяч рабочых, выключаных з рэфармісцкіх саюзаў, зьвярнуліся з адкрытым лістом да зьезду рэфармісцкіх нямецкіх прафсаюзаў, які зьбіраецца ў Франкфурце на Майне.

— Мы, выключаныя рабочыя,—гаворыцца ў лісьце, — ніколі ня здраджвалі нашым таварышом, што змагаюцца, як вашы прафсаюзныя лідэры — ЗІНЗГЕЙМЭР І УРЫХ у часе бабу бэрлінскіх мэтапістаў і зараз у барацьбе камунальных рабочых. З НАШЫХ РАДОЎ НЯ ВЫХОДЗІЛІ НАЧАЛЬНІКІ ПАЛІЦЫІ, нас вы выкідваеце, гэтыя-ж паны засталіся ў прафсаюзах і зьяўляюцца вашымі паважанымі калегамі».

Ліст канчаецца заклікам да рабочых:

— Зьнішчыце панаваньне капіталістаў і зьвязаных з імі прафбюракратаў!

Катаржныя прысуды без канца

ВАРШАВА, 29. У акруговым судзе ў Гнезьне слухалася справа 18 рабочых, якія былі арыштаваны ў Таргавіску ў часе крывавых першамайскіх выступленьняў. На лаўцы падсудных аказаліся наступныя члены ППС-ліўцы, якія фашысцкім судом абвінавачаліся ва ўдзеле ў разрухах: І. Хробак, М. Канечка, А. Васілеўскі, І. Бузяй, Ф. Будзінскі, К. Шыманскі, Б. Навачак, В. Рэзуляк, Л. Яблонскі, Ф. Пяхоцак, Т. Левандоўскі, К. Ясінскі, Ф. Сэкульскі, В. Даманскі, Ф. Надольны, К. Навакоўскі, В. Глінскіч і Ф. Цэсьлінскі.

У часе працесу выступала ў якасьці сьведак вялікая колькасьць шпікоў і паліцэйскіх, праслухаўшы якіх фашысцкі суд прысудзіў: І. Хробака на 1½ гады катаргі, Б. Навачыка, В. Рэзуляка, Ф. Пяхоцака, Т. Левандоўскага, Ф. Сэкульскага, К. Ясінскага, В. Даманскага і Ф. Надольнага — па 10 месяцаў турмы кожнага; І. Яблонскага — на 9 месяцаў турмы, М. Канечка і А. Васілеўскага — па 7 месяцаў турмы кожнага і І. Бузяя —на 5 месяцаў турмы.

АНТЫРЭЛІГІЙНЫ РУХ У ЗАХ. БЕЛАРУСІ І НА ВАЛЫНІ

ВАРШАВА, 24. Польская «Ржэч Паспаліта» зьмяшчае артыкул свайго карэспандэнта з Валыні, у якім, напамінаючы аб рэвалюцыйных наступленьнях сялян Заходняй Украіны ў мае і і жніўня, газэта піша:

«У гэтыя дні ў вёсках шматлікія групы сялян апрача палітычных дэманстрацый наладжвалі варожыя выступленьні супроць праваслаўнай царквы і духавенства. Улада зарэгістравала сотні антырэлігійных выступленьняў. У некаторых мясцох справа дайшла да ганьбаваньня могілак і сьвятынь».

«Надзвычай шматлікія групы сялян,— паведамляе газэта, — высякалі крыжы на могілках і наладжвалі дэманстрацыі ў часе набажэнства. Сяляне больш, чым дзесятка вёсак прынялі пастанову аб закрыцьці цэркваў і замене іх кінэматографамі. Праваслаўныя папы зварачаліся ўсюды за дапамогай да польскіх улад».

Напамінаючы аб гэтых выступленьнях сялян Зах. Украіны, газэта заклікае праваслаўнае духавенства да ашчэ больш цеснага супрацоўніцтва з польскімі ўладамі. (ТАСС).

***

ВІЛЬНЯ, 27. Як паведамляе віленскае фашысцкае «Слово», у Дзісьненскім і Пастаўскім паветах надзвычай пашырае́цца антырэлігійны рух, які ахапіў значную частку вясковага насельніцтва. У выніку антырэлігійнай прапаганды цэрквы зусім апусьцелі і працоўнае сялянства ва многіх мясцовасьцях кідае сьвяткаваць рэлігійныя сьвяты.

Некалькі дзён таму назад, — са скрыгатам зубоў піша «Слово», — у Паставах нехта разбурыў капліцу. У вёсцы Захараўшчына, Граздоўскай гміны, прывітальную браму, якая была пабудавана ў гонар віленскага арцыбіскупа, сялянэ разьнесьлі ўшчэнт. Пры гэтым усе крыжы былі паразьбіваны і разам з абломкамі брамы пакіданы ў раку.

У сувязі з гэтым паліцэйшчына пачала праводзіць арышты сярод сялян. Арыштавана 7 асоб, якія ў охранцы былі страшэнным чынам скатаваны.

ГІШПАНІЯ У АГНІ КЛЯСАВЫХ БАЁЎ

МАДРЫД. 29. Лік бастуючых мэтапістаў у БАРСЭЛЁНЕ дасягае 40 тыс. Учора адбыўся грандыёзны мітынг, на якім прысутнічала 15 тыс. рабочых. У Грэнадэ бастуючыя рабочыя-будаўнікі арганізавалі дэманстрацыю, якая была разагнана паліцыяй. У МАЛАЗЕ беспрацоўныя сабраліся на мітынг, на якім прынялі пастанову — патрабаваць ад улады выдачы дапамогі беспрацоўным, часовай адмены квартэрнай платы для беспрацоўных і неадкладнай арганізацыі грамадзкіх работ. У КАДЫКСЕ 2 тыс. беспрацоўных дэманстравалі па вуліцах гораду і былі разагнаны паліцыяй. У ГЕРЛАНЗЕ, у правінцыі Заморa, абвешчана ўсеагульная забастоўка. Бастуючыя патрабуюць выраўнаньня пытаньня аб беспрацоўі.

Сялянскія паўстаньні ў Румыніі

ВЕНА. 25. Як паведамляюць з Бухарэсту, па ўсёй Румыніі пашыраецца і расьце хваля сялянскага незадаваленьня, якая перарастае месцамі ў адкрытыя бунты. Так, у Дымбовічы зборшчыкі падаткаў прадалі з малатка с.-г. машыны і жывёлу сялян. Абураныя сяляне прагналі зборшчыкаў. У вёсцы Сута Сеакак (ля Тэргававіштэ) выбухнула паўстаньне ў сувязі з тым што сялянам забаранілі збор хворасту ў казённых лясох, каб прымусіць іх купляць той-жа хворост па высокіх цэнах ад дзяржавы. У адказ на гэта распараджэньне 1.600 сялян накіраваліся ў лес і (самавольна ўзяліся высякаць лес. Адбылася сутычка паміж лясьнікамі і сялянамі 5 сялян паранена. Некалькі чалавек арыштавана.

Камунальнае будаўніцтва ў Менску

У гутарцы з нашым супрацоўнікам, загадчык Мопкамгасу тав. Пінхасік спыніўся на пытаньні камунальнага будаўніцтва і добрабыту г. Менску. Пракладка брукчатага бруку на Савецкай, ад рогу Ленінскай да Камсамольскай скончана, зараз прыступлена да пракладкі брукчатага бруку на вучастку Савецкай вуліцы, ад камсамольскай, да вул. Урыцкага.

Па вул. Карла-Маркса—ад рогу Энгельса, да Чырвонаармейскай брук пакрываецца клінкерам. Трэба адзначыць, што Галоўдартранс затрымлівае дастаўку клінкеру—замест патрэбных 280.000 штук цаглін, ёсьць толькі 70.900.

З-за недахвату будаўнічых матар'ялаў вельмі слаба разгортваецца работы па каналізацыі гораду. У бягучым годзе, паводле плану, трэба ўключыць у сетку каналізацыі 700 двароў, уключана толькі 200.

— Нельга дапусьціць,—заявіў тав. Пінхасік,—зрыву камунальнага будаўніцтва гораду. Органы Дзяржпляну, Наркамсобабу і НКПрацы павінны дапамагчы камгасу і забясьпечыць будаўніцтва патрэбнай рабочай сілай і матар'ялам.

Стварыць умовы для разгортваньня работы па геафізычных досьледах у БССР

З кожным днём усё больш увагі прыцягвае да сябе вывучэньне атмасфэры. У парадак дня ўжо пастаўлены праблемы дырыжаблябудаўніцтва і шырокага разьвіцьця грамадзянскай авіяцыі. У бліжэйшыя гады гэтаму віду транспарту ў СССР павінны быць забясьпечаны нябачаныя ў сьвеце тэмпы росту і шырокія маштабы ўжываньня ў практыцы сацыялістычнага будаўніцтва.

Пад плянаваньне сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі ўсё шырэй падводзіцца навуковая база і ў ёй вывучэньне атмасфэры і клімату адыгрывае вялікую ролю.

І, нарэшце, вывучэньне атмасфэры і клімату мае вялікае значэньне для абароны краіны.

Адсюль ясна, што павінны быць скарыстаны ўсе магчымасьці і рэсурсы для таго, каб паставіць навукова-дасьледчую работу па вымучэньні атмасфэры на адпаведную вышыню.

На жаль, нельга сказаць, каб становішча работ па геафізычных досьледах апраўдвала гэты вывад. Аб гэтым сьведчаць наступныя факты: Беларускі Гідраметэаралёгічны Інстытут мае вельмі кашэтўнае абсталяваньне, якое закуплена ў 1928-29 г. за мяжой на суму некалькі дзесяткаў тысяч рубл. Гэтыя прылады дазваляюць шырока разгарнуць навукова-дасьледчую работу за ўсіх галоўных напрамках метэаралёгіі, аэралёгіі, геафізыкі наогул. Але для гэтага патрабуецца спэцыяльнае памяшканьне.

У свой час быў распрацаваны праект належнага будынку. Праект быў зацьверджан Дзяржплянам і Саўнаркомам. Будаўніцтва забясьпечана грашовымі сродкамі па каштарысе 1931 г. Была такім чынам праведзена ўся падрыхтоўчая работа. Зроблена ўсё для таго, каб, нарэшце, выцягнуць кашэтоўныя прылады з шафаў і скрынак, дзе яны зараз хаваюцца, і скарыстоўваць іх.

Аднак, да гэтага часу, ня гледзячы на ўсе клопаты, не атрымана ніводнай пагліны на будаўніцтва. Ясна, што калі ў гэтым годзе ня будуць выведзены хоць сьцены, дык будоўля зацягнецца на ўвесь будучы год і зноў будзе сарвана работа.

З такім становішчам далей мірыцца нельга. Пралетарская грамадзкасьць павінна зацікавіцца гэтай справай і дапамагчы зрушыць ня з мёртвага пункту.

Гідраметэаралёгічнаму інстытуту трэба даць магчымасьць з будучага году разгарнуць у спэцыяльным будынку работу апорнай арэаметэаралёгічнай станцыі і геафізычных досьледаў.

Праф. Кайгародаў.

Усебеларуская нарада рэдактароў раённых газэт жывёлагадоўчых раёнаў

Учора скончыла сваю работу склікана Культпропам ЦК КП(б)Б усебеларуская нарада рэдактароў раённых газэт жывёлагадоўчых раёнаў разам з работнікамі цэнтральных газэт, жывёлагадоўчага сэктару ЦК КП(б)Б, прадстаўнікамі Наркамзему, Калгасцэнтру, Сьвінаводтрэсту, Птушкаводцэнтру, Малакацэнтру і інш. цэнтральных устаноў.

З вялікай уступнай прамовай выступіў загадчык Культпропу ЦК КП(б)Б тав. Чарнушэвіч.

Нарада заслухала даклад нам. наркамзему тав. Масюкова «Аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі і задачах друку», справаздачныя даклады цэнтральных газэт — «Калгасьніка Беларусі» (т. Лебедзеў), «Оркі» (т. Кірпітэйн), «Сельгасрабочага» (тав. Гарбуноў), радыёгазэты «Калгасны заклік» (тав. Адынец) і раённых газэт «Ударнік Койданаўшчыны» (т. Кванінскі), «Ленінскі шлях» — Слуцак (т. Бугроў), «Сталінскі прызыў» — Касьцюковічы (т. Прахаронка).

У спрэчках выказаліся т. т. Аскерка і Квачоў (Жывёлагадоўчы сэктар арганізацыі ЦК КП(б)Б), Міцькоў (Белкалгаспэнтр), Лычкоўскі (Клімавічы, газэта «Камуна»), Гудаў (Тураўскі раён), Красоўскі (Сьвінаведкалгаспэнтр), Ар[illegible]чыньнікаў (Сьвінаводтрэст), Цыганчук (Уваравіцкі раён) Салдаценка (сэктар друку ЦК КП(б)Б) і інш.

Нарада заслухала даклад т. Вержбаловіча (нам. рэдактара газэты «Рабселькор») аб штодзённых палявых газэтах.

Нарада ўключылася ва ўсесаюзны паход за калгаснага каня, абвешчанай ЦО УсеКП(б) газэтай «Правда» і прыняла на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў барацьбы за сацыялістычную жывёлагадоўлю

БУРАК ЦІ БРУЧКА?

Вырашэньне жывёлагадоўчай праблемы — актуальнейшае пытаньне сёньняшняга дня ў сельскай гаспадарцы БССР.

Узятыя партыяй тэмпы будаўніцтва буйных сацыялістычных жывёлагадоўчых гаспадарак — арганізацыя новых сьвінагадоўчых саўгасаў, малочных і сьвінагадоўчых калгасных фэрм—даюць гарантыю ў тым, што ў бліжэйшы годзе жывёлагадоўчая праблема будзе намі вырашана, як і збожжавая.

Стварэньне моцнай кармовай базы зьяўляецца асноўнай умовай для замацаваньня існуючых жывёлагадоўчых гаспадарак і далейшага разгортваньня жывёлагадоўлі.

У кармовым балянсе прадукцыйнай рагатай жывёлы сакавітыя кармы кожны год займаюць усё большы процант. Аднак, ня гледзячы на значнае пашырэньне плошчы кораньплодаў, наша прадукцыйная жывёла з-за нізкіх ураджаяў атрымлівае сакавітыя кармы ў мізэрнай дозе.

У Даніі прадукцыйная рагатая жывёла атрымлівае ня менш 35 процантаў сакавітых кармоў да агульнага ліку сухога корму за стойлавы пэрыяд. Амэрыканцы ідуць ня ўпоцкі далей. Яны лічаць, што сухі корм у выглядзе сена і саломы для прадукцыйнай рагатай жывёлы трэба даваць у мінімальным разьмеры, як дыетычны корм.

Паводле кармовых норм Наркамзему БССР на адну штуку прадукцыйнай рагатай жывёлы на стойлавы пэрыяд пры падаі 3 тоны сілосу, рэшта сакавітых кармоў напаўняецца кораньплодамі, галоўным чынам кармовымі буракамі. Гэта значыць, што ўсярэднім кожны дзень стойлавага пэрыяду карова павінна атрымаць апрача сілосу 9,2 клг. кораньплодаў.

Пры праектаваньні пасеўных плошчаў і пры засеве іх гаспадарчымі арганізацыямі нібы атрымліваецца, што гэтыя нормы Наркамзему вытрымліваюцца. На справе-ж мы маем зусім іншае. І вось чаму.

Пры праектаваньні і засеве кораньплодаў галоўны ўпор узят на культуру кармовага бурака (70 проц. ад агульнага пасеву кораньплодаў), які прад'яўляетаньні вялікія запатрабаваньні глебе, клімату і асабліва агратэхніцы. Пры гэтым зусім забылі пра такія кораньплоды, як бручка, якая ў нашых глебавых, кліматычна, і агра-тэхнічных умовах дае пайных і агра-тэхнічных умовах дае пайных і двойны ўраджай у параўнаньні з бураком.

Вельмі часта супроць бручкі прыводзяць такі довад, што быццам на яе трацціца больш рабочай сілы, бо бручку трэба садзіць расадай (25-30 чалавекадзён на 1 га). Але пры гэтым ня трэба забываць, што далейшы догляд бручкі дае значна большую эканомію ў рабочай сіле, чым догляд буракоў. Так, у пачатку разьніцы зельля на працоўку аднаго гэктара бручкі патрэбна 1,25 чалавекадзён, у той час, калі для буракоў патрэбны 32 чалавекадні на адзін га на дзьве праполкі. У адваротным выпадку ўраджай калі не загіне, дык будзе зусім мізэрны.

Трэба дадаць, што гэты лік працадзён для праполкі буракоў патрэбен у самы разгар уборкі сена і жнива. Пасадка-ж бручкі робіцца ў канцы веснавой сяўбы, калі напружанасьць з рабочай сілай зьмяншаецца.

Такім чынам эканомнасьць працы і вышэйшы ўраджай бручкі даюць эканамічныя прадпасылкі для пасеву бручкі ў большай колькасьці чым буракоў.

А можа на сваёй кармовай якасьці бручка горшая, чым бурак? Не, ні ў якім разе. Наадварот, бручка па свайму складзе больш спажыўная, чым бурак: крухмальны эквівалент бручкі—7,5, а кармовых буракоў—5, страўнага бялка ў бручцы—0,3, а ў буракох—0,1, сухая маса бручкі—12,2, а буракоў—10,5. Значыцца і тут бручка карысьнейшая за бурак.

Усе гэтыя матывы паказваюць, што бручка ў нашых умовах хутчэй вырашыць праблему сакавітых кармоў у балянсе кораньплодаў, чым бурак.

К. У—по.

АД РЭДАКЦЫІ: Зьмяшчаючы гэты артыкул у парадку прапановы, мы просім зацікаўленыя арганізацыі і спэцыялістаў выказаць сваю думку на гэтым пытаньні.

Ілжэспэц „пристроился"

Імя Рытмана засталося невядомым фінаддзелу толькі таму, што патэнт 4-га разраду на гуртовы гандаль лыкамі лічыўся на імя яго сваякоў. На справе-ж вароча справамі Рытман з жонкай Сорынай. Гэта было зусім нядаўна. Зараз-жа Рытман стаў «спэцам» па лясных справах. Гандляр Рытман пры дапамозе нейкага Цэйтліна пастуціў бракерам у аддзел лесазбыту Лесбелу (Менск). Зараз сядзіць Рытман у Ворпы ў сваёй жонкі, атрымлівае пэнсію з Лесбелу, але ніякай работы не праводзіць. Неабходна прыцягнуць да адказнасьці тых, што прынялі на работу классава-чужога чалавека, ілжэ-спэца, а самаго Рытмана неадкладна зволіць.

Рабочы.

Паведамленьні

— ЦКК і Гар. КК КП(б)Б на 31 жніўня г. г. склікаюць шырокую нараду актыву РСІ з наступным парадкам дня: 1. Аб задачах часопісі «За тэмпы, якасьць, праверку» (орган ЦКК-НКРСІ СССР). Дакл. прадстаўн. рэдакцыі часопісі т. Вінаградаў. На нараду павінны зьявіцца грамадзкія інспэктары РСІ, актыў Бюро Скаргаў, лёкія кавалерысты, добраахвотнікі-абсьледавацелі, кіраўнікі шэфскіх брыгад, камісіі садзейнічаньня РСІ, рабкоўскі актыў і ўпаўнаважаныя па распаўсюджваньні друку. Нарада адбудзецца ў залі пасяджэньняў Гаркому КП(б)Б роўна ў 6 гадз. вечара, (вул. Энгельса № 28).

— Мен. Гар. КК КП(б)Б-РСІ прапануе зьявіцца 31-VIII-31 г., у 10 гадзін раніцы, сакратаром п-кал. і яч.—Цэхі, «Полымя Рэвалюцыі», «Ударнік», гуты «Пралетары», Хлебазаводу, скарняжная фэкі, Менбуду, Белпакой 14), з матар'ялам аб праведзенай працы па падрыхтоўцы да прызыву ў Чырв. армію 1909 г. нар. Яўка абавязковая.

Праграма радыё-перадач

ПАНЯДЗЕЛАК 31-га ЖНІЎНЯ

6—00—Фізкультура і раніш. нав. (трансляц. Масквы).

7—00—Перадача радыёграм.

11—00—13—00 — Рабочы поўдзень (трансляц. Масквы).

17—25—Прагноз надвор'я на заўтра.

17—30—Канцэрт для выхонд. і вымен. рабочых.

18—30—Перадача на яўрэйскай мове (газэта).

18—55—Музычны адпачынак.

19—00—р.-г. «Піянэр Беларусі» з муз. ілюстрацыяй.

19—30—р.-г. «За бальшавіцкія тэмпы».

19—55—Музычны адпачынак.

20—00—р.-г. «Камсамолец Беларусі».

20—25—Музычны адпачынак.

20—30—р.-г. «Калгасны заклік»

20—55—Музычны адпачынак.

21—00—гутарка р.-г. «Піянэр Беларусі».

21—30—Канцэрт.

23—30—Вячэрні выпуск р.-г. «За бальшавіцкія тэмпы».

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

„Чырвоная Зорка" — ШПАРГАЛЬЩЫ І НАШЧЫ, камедыя ў 8 частках. ЗВЫШ ПРАГРАМЫ ТРЫМАЙ ЗЛОДЗЕЯ.
„КУЛЬТУРА" Пач. у 7; 8-45; 10-30 — Новы выдатны мастацкі бытавы фільм 2 МАТКІ 2 драма ў 6 частках.
„Пралетары" Адкр. з 12 г. дня. — Мастацкі фільм ПРАКАЖОНАЯ драма ў 6 частках.
„Інтэрнацыянал" Пач. 1 с. у 7 г. в. — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ПАЎНОЧНАЕ КАХАНЬНЕ драма ў 7 частк. Звыш праг. кіно-хрон. БДК № 14.
„Юны Піянэр" (будынок кіно „Культура") — Два фільмы ў адзін сэанс 1) Люлька Камунара 2) Паляваньне на Гарылу Пач. у 1 дня Каса—ад 11 дня.
„СПАРТАК" Пач. 6-30, 8, 9-30 і 11 Каса—з 6 гадз. — Ігар Ільінскій у карціне ЛЯЛЬКА З МІЛЬЁНАМІ камедыя ў 8 частках

Беларускі Фінансава-Эканамічны Інстытут АБВЯШЧАЕ, ШТО Ўступныя Іспыты ў ноў паступаючых пачнуцца з 7-га верасьня 1931 г. у 10 гадзін раніцы, у галоўным корпусе БДУ (аўдыторыя 203).
Асобы якія атрымалі паведамленьне аб іспытах, павінны зьявіцца ў інстытут да паказанага часу.
ПРЫЁМ ЗАЯЎ на 1-ы КУРС асьнянага набору — 1931 году працягваецца да 10-га верасьня 1931 г.
Заявы пасылаць у НКФ БССР (сэктар кадраў).
Правілы прыёму глядзіце газэты „Зьвязда" № 213 ад 8-VIII—31 г., „Савецкая Беларусь" ад 27-VII і 1-VIII—і „Калгасьнік Беларусі"—ад 29-VII і 3-VIII—31 г.
Дырэкцыя.

У парадку разьвіцьця пастановы СНК СССР ад 21 чэрвеня 1931 г. аб паскарэньні падрыхтоўкі спэцыялістаў тэхнікаў з найбольш падрыхтаваньня рабочых і на падставе загаду па ВСНГ СССР за № 49 ад 11 ліпеня 1931 г.
Бабруйскі лесатэхнічны тэхнікум — АБВЯШЧАЕ — набор на 2-гі курс 30 асоб і на 3-ці курс 30 асоб.
Прымаюцца найбольш здольныя, пасьпяваючыя студэнты вячэрняга рабфаку, скончыўшыя ФЗУ на базе 7-годкі, скончыўшыя школу заводзкага вучнёўства павышага тыпу, рабочыя, якія маюць незакончаную сярэднюю тэхнічную асьвету, а таксама скончыўшыя школы 2-й ступені з вытворчым стажам ня менш 2-х год.
Тэрмін падачы заяў і камандыровак да 10 верасьня 1931 г.
Набор будзе праводзіцца з папярэднімі іспытамі. Матар'яльныя умовы для прынятых на гэтыя курсы агульныя для нашага тэхнікуму.
Заявы падаваць на Імя тэхнікуму:
г. Бабруйск, Савецкая, 16.
Дырэктар тэхнікуму П. Штыцно.

Камуністычны Ун-тэт Беларусі імя Леніна
паведамляе, што студэнты II і III курсаў усіх аддзяленьняў павінны зьявіцца ў Камвуз 5 верасьня г. г.

Гомельскае аддзяленьне Белдзяржкіно
даводзіць да ведама ўсіх зацікаўленых арганізацый, што з 20 жніўня пры рэмонтным майстэрні Гомдзяржкіно (Камунарава, 2)
АДКРЫТА
Ўстановачнае бюро кіно-стацыянараў.
Прымаюцца заявы на абсталяваньні кіно-будак і ўстаноўцы стацыянарных кіно-апаратаў. Заказы накіроўваць па адрасе:
гор. Гомель, Камунарава, 2,
БЕЛДЗЯРЖКІНО.

ЗАВОЧНЫ СЭКТАР РАБФАКУ БДУ працягвае набор студэнтаў да 1-га кастрычніка г. г.
Прыём гэтага году павялічваецца да 2.000 асоб.
Жадаючыя паступіць павінны даслаць наступныя дакументы:
1. Анкету: да анкеты прыкласьці заяву з паказаньнем на які курс жадае паступіць.
2. Спраўку аб сац. становішчы паступаючага і яго бацькоў.
3. Пасьведчаньне аб адукацыі.
4. Пасьведчаньне аб нарадзінны.
5. Копію вайсковага білету (для мужчын).
Дакументы дасылаць па адрасе:
Менск, Унівэрсытэцкі гарадок, галоўны корпус, пакой № 2-14, завочнаму рабфаку пры рабфаку БДУ.
Загадчык навучальнай часткі Дзяржынская.

ДАВОДЗІЦЦА да ведама усіх Райкомаў КП(б)Б і паступаючых у Гомельскую саўпартшколу, што з 1-га кастрычніка г. г. пры саўпартшколе адкрываецца
польскае аддзяленьне:
Жадаючыя паступіць на польскае аддзяленьне саўпартшколы павінны падаць заявы не пазьней 15-IX у адпаведныя райкомы КП(б)Б.
Аб умовах прыёму можна даведацца на ўсіх райкомах і гаркомах КП(б)Б.
Нам. загадчыка саўпартшколы Кулікаў.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ на 1-шы курс Мсьціслаўскага Падтэхнікуму і на аднагадовыя пядкурсы працягнут да 15 верасьня 1931 г.

СЭКТАР КАДРАЎ
Горна-Разьведачнага Кіраўніцтва ВСНГ БССР
абвяшчае, што адкрыт прыём па завочным навучаньні ў МАСКОЎСКІ І ЛЕНІНГРАДСКІ
ГЕАЛЁГА-РАЗЬВЕДАЧНЫЯ ВУЧЭБНЫЯ КАМБІНАТЫ,
якія ставяць сваёй мэтай падрыхтоўку спэцыялістаў геалёга-разьведачнай службы завочным шляхам.
Завочнае навучаньне падзяляецца на канцэнтры:
IV КАНЦЭНТР
рыхтуе геалёгаў, гідра-геалёгаў, інжынэраў разьведчыкаў, маркшэйдараў. Тэрмін навучаньня 4 гады
III КАНЦЭНТР
рыхтуе тэхнікаў па разьведках, гідра-геалёгаў, буравой і маркшэйдарскай спэцыяльнасьцях. Тэрмін навучаньня 3 гады
II КАНЦЭНТР
рыхтуе бурмайстраў, калектараў па ручным машынаправацельным і ударным бурэньні. Тэрмін навучаньня 1 год 4 м-цы.
Асобам, скончыўшым завочныя навучальныя ўстановы, прадастаўляюцца адпаведныя правы са стацыянарнымі навучальнымі ўстановамі.
Прыём праводзіцца на працягу ўсяго году па камандыроўках ГРК ВСНГ БССР, партыйных, камсамольскіх і пр